АСТРАМЕЧАЎСКІ РУКАПІС



БРЭСЦКІ РАЁННЫ КРАЯЗНАЎЧЫ АЛЬМАНАХ

№ 3 [19]•2017







135 гадоў з дня нараджэння Янкі КУПАЛЫ

7 ліпеня спаўняецца 135 гадоў з дня нараджэння Янкі Купалы. Першы і самы народны паэт беларускай зямлі, заступнік народных інтарэсаў, трыбун нацыянальнага Адраджэння, ён стаў для беларусаў літаратурным класікам і сапраўдным сімвалам нацыі.

Нарадзіўся Янка Купала ў фальварку Вязанка Вілейскага павета (цяпер — Маладзечанскі раён) у сям'і арандатара. Скончыў Беларускае народнае вучылішча. Пасля смерці бацькі ў 1902 годзе займаўся гаспадаркай, быў настаўнікам і пісарам, прыказчыкам, практыкантам і нават памочнікам вінакура на прыватнай півварні...

Усё гэта дазволіла яму вывучыць жыццё і звычаі землякоў, народную творчасць і фальклор. Да 26 гадоў сярод яго творчых напрацовак ўжо былі першыя вершы.

На працягу 1908–1913 гадоў у Пецярбургскім выдавецтве «Загляне сонца і ў наша ваконца» выходзяць яго паэтычныя зборнікі: «Жалейка», «Гусляр», «Шляхам жыцця». Паралельна Янка Купала працуе ў «Нашай ніве» — першай беларускай нацыянальнай штотыднёвай газеце, дзе друкуе вершы і нататкі, крытычныя артыкулы і перадавіцы. У 1914 годзе стаў галоўным рэдактарам гэтай газеты. Да гэтага часу ім ужо былі створаны творы, якія стануць несмяротнымі: паэмы «Адвечная песня» і «Сон на кургане», п'еса «Паўлінка».

У 1919 годзе ён пераязджае ў Менск, і тут з-пад яго пяра выходзяць такія творы, як «Раскіданае гняздо» і «Прымакі», «Магіла льва», «Курган», «Тутэйшыя».

Жыццё паэта было напоўнена не толькі творчасцю, але і актыўнай грамадска-палітычнай дзейнасцю. Пра жыццё і творчасць паэта сёння распавядаюць у Літаратурным музеі Янкі Купалы ў Мінску, у яго філіялах у Вязанцы, Ляўках, Харужанцы, Яхімоўшчыне. Імем паэта названы Інстытут мовы і літаратуры Нацыянальнай Акадэміі Навук Беларусі, Гродзенскі дзяржаўны універсітэт, вуліца, парк і станцыя метро ў Мінску, праспект у Гродна, мемарыяльныя запаведнікі ў Вязанцы і Ляўках, ландшафтны заказнік у Акопах.





АСТРАМЕЧАЎСКІ РУКАПІС

БРЭСЦКІ РАЁННЫ КРАЯЗНАЎЧЫ АЛЬМАНАХ

НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЛІТАРАТУРНАЕ ВЫДАННЕ

БРЭСЦКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

АДДЗЕЛ ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОТЫ, КУЛЬТУРЫ І ПА СПРАВАХ МОЛАДЗІ РАЙВЫКАНКАМА

БРЭСЦКАЕ АДДЗЯЛЕННЕ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ (ГРАМАДСКІ ФУНДАТАР)

РАЁННЫ ДОМ РАМЁСТВАЎ

Рэдактар і ўкладальнік:

Аляксандр Валковіч

Аўтар праекта:

Аляксандр Валковіч

Камп'ютарная вёрстка:
В.У. Бараньчыкава, І.П. Суворава
Карэктар Н.У. Раеўская

Кантакты:

(+375 29) 20-161-02
(+375 162) 965-957
e-mail: kotlas@tut.by

Падпісана да друку 05.09.2017.
Фармат 70x100 1/16. Гарнітура PF Agora Serif Pro.
Тыраж 99 экз. Ум. друк. арк. 8,10.
Друк цыфравы. Надрукавана ТДА «Артлайнсіці»,
г. Брэст, вул. Карбышава, 74.
Арыгінал-макет падрыхтаваны
ТАА «Паліграфіка», зак. 235-2017.
Пасв. 2/2 ад 16.08.2013, пасв. 1/22 ад 16.08.2013,
вул. Стафеева, 21, 224007, г. Брэст
тэл. (+375 162) 49-26-79, www.poligrafika.by

1-я с. вокладкі: Восень

1-я і 4-я с. вокладкі: Святочны рушнік

У афармленні выкарыстаны выцінанкі мастачкі Святланы Вяль

Выходзіць штоквартальна
Мова: беларуская, руская

№ 3 [19]•2017

У НУМАРЫ

Прысвечваецца Пятру КЛІМУКУ

Вітаў з арбіты родны край

У Беларусі вёска ёсць —
Завецца Камароўка.
Жыхар яе — Усяленнай госць,
Дык пра яго й прамоўка.

Жыў-быў у вёсачцы хлапчук —
Звычайны, бы ўсе дзеці,
З прыгожым прозвішчам Клімук,
З цудоўным імем Пеця.

І мара ў Петрыка была —
Стаць лётчыкам крылатым
Ды ўзляцець вышэй бусла,
Які кружыць над хатай.

Пакуль хлапчына падрастаў,
Пакуль вучыўся ў школе —
Высокай мары не губляў
Ні ў снах, ні ўдзень — ніколі.

Час марна траціць не хацеў...
І вось пара прыспела —
Арліных крыл сабе займеў
І ўвысь рвануўся смела.

І шлях яго зазіхацеў
Стазорнай пазалотай,
Бо дабівацца ўсяго ўмеў
З вялікаю ахвотай.

Да зорак вырвацца жадаў
І ў поспех моцна верыў,
Ды так, што лёс паспачуваў, —
Адкрыў у космас дзверы.

Адтуль вітаў лугі, бары,
Прыбужжам любаваўся,
З бязмежным небам гаварыў
І — на Зямлю вяртаўся.

Ды не адзін раз, ажно тры
Ў Сусвет насілі крылы,
Але матулін дом стары
Вяртаў яго ў кут мілы.

Хоць прыцяжэнне ўсёй Зямлі
Адольваць навучыўся,
Ды вёска, дзе бацькі жылі,
Заўжды радней за высі.

Надзея ПАРЧУК

Томашовка
Комаровка

Как аист в родное гнездо, вернулся космонавт Петр Климук на Малую Родину в день своего 75-летия

10 июля человеку-легенде Петру Ильичу Климуку исполнилось 75 лет. Первый белорусский космонавт, дважды Герой Советского Союза, летчик-космонавт СССР, генерал-полковник авиации — это лишь часть званий и регалий именинника — свой юбилей отпраздновал на Брестчине.

Петра Ильича душевно чествовали на малой родине: в деревне Комаровка, в Томашовке, в Бресте, в Остромечево... Почетный гражданин Брестской области чувствовал себя, как дома, в любом месте, где его тепло приветствовали земляки, от мала до велика.

— В Беларусь всегда возвращаюсь с радостью, как аист в родное гнездо! — примерно так сказал Петр Ильич на одной из встреч.



«Живите и здравствуйте, Петр Ильич! Вы — наша национальная гордость!» — вот лейтмотив многочисленных выступлений и приветствий, прозвучавших в устах земляков в эти знаменательные дни.







Остромечевцы тепло встречали первого белорусского космонавта, а также сфотографировались на память в саду имени Петра Климука



К 75-летию космонавта Петра Ильича Климука

Мечта



Сижу. Мечтаю о луне.
Как хорошо там было б мне!
Не надо думать об уроках,
Решать задачки каждый день.

А, может, мне спросить у Климука,
Как к звездам мне попасть наверняка?
Увидеть все воочию.

Ведь Петр Ильич — для нас пример,
Он космос покорял втройне.
Таким хочу я тоже стать,
Любить, мечтать и покорять.

Ведь я люблю кометы, звезды,
Смотреть в вечерний небосвод,
Искать упавшую звезду
И загадать свою мечту.

Но точно знаю я ответ:
Ведь для того,
чтоб к звездам мне попасть,
Не надо на уроках о луне мечтать,
А все предметы на «десятку» знать.

И быть здоровым тоже важно,
Со спортом быть всегда отважным,
Любить родителей, друзей
И быть примером для детей.

Павел ДОРОШУК, ученик 5-го класса Лыщицкой СШ

Дайте в руки мне гармонь!

Штрихи к портрету Александра ОГИЕВИЧА — гармониста, художественного руководителя народного ансамбля песни и музыки «Астрамечаўскія Лявоны»



Родился Александр Огиевич в деревне Рубель Столинского района в трудовой сельской семье. Историки и краеведы до сих пор не пришли к единому мнению относительно этимологии названия деревни, крупнейшей в Беларуси, насчитывающей около четырех тысяч жителей. Некоторые старожилы объясняют происхождение названия так: «Нехто ехав чэрэз болото и зрубив ель, коб выбраться. Вот вам и Руб-ель». Другие вспоминают прочную жердь, которую укладывают поверх воза с сеном, чтобы тот при езде не разваливался — рубэль. Лично я склонен придерживаться второй версии, имея в виду то, что выходцы из деревни Рубель отличаются человеческой основательностью, надежностью, предприимчивостью, хотя «рублевое», «денежное» звучание топонима в связи с материальным благосостоянием местных жителей всерьез не рассматриваю. Но вот о духовном, творческом их потенциале поговорить, безусловно, стоит.

Пробовать играть на гармошке Саша Огиевич начал лет так с семи. Трофейную гармонь привез из Германии отец Михаил Андреевич, участник Великой Отечественной войны, механизатор местного колхоза «Рубельский». А так как ему самому вместе с женой Ольгой Григорьевной, колхозным полево-



дом, заниматься музыкой было недосуг, а ближайшая музыкальная школа находилась за 17 км в Давид-Городке, то маленький Саша «пиликал» на инструменте в свое удовольствие и во что горазд. И так поднаторел, что охотно «перебирал лады» даже на свадьбах... (Гармонист-то непьющий, всяко сможет подменить «уставшего» дяденьку-музыканта!)

Наконец одаренного мальчишку приметил учитель музыки Леонид Иванович Леоновец. Предложил обучить парнишку игре на баяне. С родителями мальчика договорились «баш» на «баш»: те берут учителя на квартиру, а в качестве платы за жилище он обучает сына музыкальной грамоте. «Рублевая» сущность данной сделки привела к ожидаемым результатам: через полтора года домашнего обучения Саша освоил программу 5-го класса музыкальной школы. Крепнущее год из года мастерство юного музыканта позволило ему активно участвовать в различных конкурсах. Например, хорошо показал себя Александр на областном смотре молодых музыкантов в Бресте, где исполнял













на баяне знаменитый «Полонез Огинского». Для человека, склонного к ассоциациям, словосочетание «Огиевич — Огинский» звучит вполне символично, что, впрочем, небезосновательно...

Нашел свое место молодой музыкант и в духовом оркестре при Рубельском СДК, где играл на корнете (трубе).

В 1971 году Александр закончил Рубельскую СШ, на следующий год поступил на факультет сельскохозяйственного строительства Брестского инженерно-строительного института. На пятом курсе женился на прекрасной девушке Анне Лешкевич. Потом была военная служба, «дембель», возвращение в «родны кут». А в 1982 году переехал вместе с женой, малолетними сыном и дочерью на работу в знаменитое Остромечево. Вслед за старшим братом, уже основавшимся здесь в качестве тракториста.

Это как раз был тот период, когда энергичный председатель колхоза Алексей Скакун собирал вокруг себя и строящегося современного комплекса по откорму КРС лучшие производственные и творческие силы. В судьбе очень многих людей, ставших впоследствии, как говорится, лицом Остромечево,







Алексей Степанович Скакун и поныне остается «крестным батькой», наставником, старшим товарищем, другом. К этому времени в Остромечево уже существовал духовой оркестр, куда Александра Огиевича с радостью приняли, действовали ансамбль гармонистов, женская вокальная группа, переросшие в ансамбль «Лявоны», переименованные затем в «Остромечевские». Под управлением талантливого композитора и вокалиста Федора Мозоля. И первое произведение, которое молодой гармонист Огиевич исполнял в составе названных коллективов, конечно же, — белорусская «Лявониха».





Вместе с ансамблем, получившим со временем почетное звание народного, Александр Огиевич прошел большой и славный путь, заслуженно став его художественным руководителем. Наверное, нет нужды перечислять музыкальные фестивали, конкурсы, праздники, импрезы, в которых участвовал этот творческий коллектив. Остромечевские артисты — всегда желанные гости любого концерта, любого мероприятия любого ранга, будь то местного, районного, областного, республиканского или международного. Ансамбль, что называется, навсегда «прописался» в соседней Польше, с блеском выступал в Словакии, России. Буквально везде их принимают на «ура». Ни одни «Дожинки» в нашем районе и области не обходятся без участия «Астрамечаўскіх Лявонаў». Немалая заслуга в этом не только самих музыкантов, вокалистов, их творческих руководителей, но и администрации прославленного хозяйства ОАО «Остромечево», которая, как говорится, выпестовала коллектив и сопровождает отеческой заботой на всем творческом пути. Можно смело называть колыбелью «Лявонов» Остромечевский СДК во главе с бессменным директором, вокалисткой и плясуньей Людмилой Мельник, которая является активной участницей ансамбля, организатором и вдохновителем концертов буквально с первых лет его создания. Необходимо также сказать о традиции, преемственности, ибо с уходом на пенсию прежнего директора Алексея Скакуна бренд Остромечево — «Астрамечаўскія Лявоны» — ничуть не поблек, а благодаря стараниям новой администрации во главе с Олегом Бураком, Жанной Горустович и другими приобретает новые оттенки и краски.

В начале своих заметок я акцентировал внимание на этимологии названия деревни Рубель (как связующая основа) — родины Александра Огиевича, а также созвучии фамилий «Огинский — Огиевич». Мне кажется, данные значения, совпадения и словосочетания знаковые и не случайны. Что такое «худ-рук» ансамбля? Это тот, кто объединяет талант и мастерство каждого музыканта, вокалиста в единое целое. Это тот, кто в ходе репетиций, концертов руководит вокалом, соло, хором и оркестром. Кто подбирает репертуар, соблюдая песенно-музыкальную традицию, суть и соль. Кого слушают и уважают как музыканта и человека. Кто ведет за собой, цементирует, не позволяя разваливаться и фальшивить. Кто головой и сердцем отвечает за успех. Кто до последнего верен мелодиям и песням родного края и сочиняет в их честь свой душевный «Полонез». И все это — гармонист, баянист, трубач, композитор, аранжировщик Александр Огиевич. Он занимается обработкой белорусских народных песен и мелодий, переводом текстов с родственного нам украинского языка, сочиняет новые композиции, работает с оркестровой группой и солистами, разучивает с ансамблем польки, вальсы, полонезы... Словом, ХУДОЖЕСТВЕННО РУКОВОДИТ! (Мне это напоминает пассаж из популярной песни: плясунья — так пляши!)

Внешне Александр не похож на «застольного вождя». Он скромен в общении и в быту, среди окружающих держится, можно сказать, нерешительно. Но вот возьмет в руки гармонь — и преображается. Уверенность. Обаяние. Задор. «Дайте в руки мне гармонь — золотые планки...»

Александр ВОЛКОВИЧ
Фото Михаила ГУБАРЕВА







Лявоны, гармонь і Скакун...



Из семейного альбома Александра ОГИЕВИЧА



Саша возле дома в д. Рубель.
Примерно 3 года.



Саша Огиевич с трофейной немецкой гармошкой. Примерно 4-й класс



Колхозный духовой оркест. Огиевич – второй слева



Служба в СА. Черновцы



В доме родителей после росписи. 12 сентября 1976 г.


С женой Анной и дочкой Светланой


Проводы зимы в Остромечево. Лявоны. 1998 г.


Удачная «тихая охота»


С женой Анной и сыном Михаилом


Новый год в Остромечево. Семейство Огиевичей

Из репертуара «Астрамечаўских Лявонаў»

Белорусские и украинские народные песни в обработке Александра ОГИЕВИЧА

Гарманіст

Па сялу гуляе гарманіст,
Жартаўнік, сусед наш і артыст.
Гарманіст, давай, іграй смялей,
Сваёй песняй сардэчка мне сагрэй.

Прыпеў:
Гарманіст, гарманіст іграе,
А душа, а душа спявае,
Гарманіст, гарманіст смяецца,
І сардэчка так моцна б'ецца.

Гарманіст заснуць нам не дае,
Ён кадрылі, полькі выдае,
Хлопцам ўсім і дзеўкам весяло,
І гуляе ўсё наша сяло.

Прыпеў.

Зноў гармонік разлівае спеў,
У даль ляціць Лявонаўскі напеў,
Спяваюць з намі рэчкі і лясы,
І звіняць, як струны, галасы.

Прыпеў:
Гарманіст, гарманіст іграе,
А душа, а душа спявае,
Гарманіст, гарманіст смяецца,
І сардэчка так моцна б'ецца.

Хачу на мора

Наступіла лета, зелянее жыта,
На поле, як шнурочкі, цукровы буракі,
А мы сабе ў радочку прыселі на грудочку
Такі сабе прыкольныя, румяныя жанкі.

Прыпеў:
Ой, гора, гора, хачу на мора,
Хачу пад пальму на жоўты пясок.
Хачу, каб грэла сонейка цела,
Хачу на мора хоць на часок.

Заганю карову ў цёмну дуброву,
Не хачу я смятаны, не хачу малака.
Я сяду на дыету, не буду есць катлету,
І буду, як мадэль я, высока і страйна.

Прыпеў.

Хай судзяць мяне людзі, я слухаць іх не буду,
Хай на маім агародзе квітнее лебяда.
Прадам усю скаціну, куплю сабе машыну —
Я хачу пагуляці, бо яшчэ малада.

Прыпеў.

Наступіла лета, зелянее жыта,
На поле, як шнурочкі, цукровы буракі,
А мы сабе ў радочку прыселі на грудочку
Такі сабе прыкольныя, румяныя жанкі.

Прыпеў.



НАРОДНЫЯ СВЯТЫ І ЗВЫЧАІ БЕРАСЦЕЙШЧЫНЫ

«Шуплем есць, лапаткаю ходзіць»: вобраз качкі ў фальклоры Берасцейшчыны



Качка як вадаплаўная птушка ў традыцыйным светапоглядзе берасцейцаў, як і іншых беларусаў, звязана з рознымі стыхіямі і ярусамі светабудовы. Але найбольш частотнай сімвалічнай карцінай фальклорных твораў розных жанраў выступае плаванне качкі па моры — гл. песенную канструкцыю: «Я не вутачка па мору плаваць» ці загадку «Вутка ў моры — хвост на заборы. — Апалонік». Гэтая характарыстыка качкі як яе міфалагічная прыкмета адыгрывае пэўную ролю ва ўяўленнях пра сувязь птушкі з тварэннем свету, яго пачаткам і канцом. Шырока вядома казка пра смерць Кашчэя, якая знаходзіцца ў яйцы, а тое — у качцы, змешчанай у зайцы і г. д., а ўсе гэтыя хтанічныя персанажы лакалізуюцца ў карэннях дуба — Сусветнага дрэва. З дубам звязана лакалізацыя вутак і ў замовах. Так, у замове ад хвароб жывёлы гаворыцца пра дуб-бартняк з дванаццаццю сукамі, які стаіць на «кіяні-моры, пад каменем Латыром»; а на тым дубе ў дванаццаці гнёздах «дванаццаць вуціц».

У шэрагу кантэкстаў качка надзелена ***дэманічнымі ўласцівасцямі***, звязана з ***нячыстай сілай, душой нячыстага памерлага,*** выступае іпастассю ***чорта.*** **Апавядаюць, як чорт паказваўся чалавеку то воўкам, то зайцам, то вуткай.** Лічылі, што душа тапельца абавязкова павінна нейкі час плаваць у выглядзе «сіняе качкі». «Вуцячымі» («вуцінымі»), паводле замоў, бываюць «іспугі, урокі, прыгаворы», «дзівы, падзівы»; замаўляюць «спуг, лёк... казіны, вуціны, гусіны...».

Качка нярэдка выступае адным са звёнаў ***метамарфоз*** чалавека. У чарадзейных казках тры або дванаццаць качак-сясцёр скідваюцца дзяўчынамі-прыгажунямі; адна з іх, стаўшы жонкай героя казкі, ратуе яго, ператварыўшы ў селезня (качара). У залатую качку ператвараецца кінутая ў ваду трэска ад яблынькі, а гэтая качка потым становіцца Партупеем Прапаршчыкам. Шлюбная сімволіка ператварэнняў чалавека ў качку актуалізавана і ў песнях з матывам «дзяўчына пойдзе гуляць цераз вулачку серай вутачкай» ці «пойдзе да каханага чэраз мора шэрай вуткай».

Як дзікія, так і свойскія качкі фігуруюць у народнай метэаралогіі,

каляндарна-абрадавым фальклоры, найперш — вясновым. Лічылі, што дзікія гусі і вуткі прылятаюць з выраю аднымі з першых. Казалі, што на пятым тыдні Вялікага посту («Похвальная неделя») у лесе дзікая качка знясе яйка «і ўжэ пахваліцца». На Спаса качкі і гусі (з капустай) былі святочнай ежай [Збірагі Брэсцкага р-на]. У прыкметах паводзіны качкі найчасцей паказваюць на ***непагадзь, дождж*** [Мачулішчы Камянецкага р-на]; «як уткі носы ховають — будэ холод» [Знаменка Брэсцкага р-на]. Паводле іншых прыкмет, калі дзікія качкі робяць свае гнёзды ля самой вады, то наступнае лета будзе сухое, а чым далей ад вады, тым лета будзе макрэйшым. У вясновых песнях вуткі згадваюцца разам з іншай свойскай жывёлай, якая з надыходам цяпла актывізуецца, выходзіць на адкрытую прастору, пашу, і заклінаецца на добры «вод»; у «вутачкі лугавой» пытаюцца, дзе яна «зіму зімавала».

У песенным фальклоры качка сімвалічна звязана з ***сацыяльным статусам чалавека***, выступае пашыраным вобразам дзяўчыны на выданні, жанчыны, а селезень — жаніха, мужчыны. З вуткай сімвалічна асацыюецца ***маці***. Да маці звяртаюцца: «Моя матухно-вутко, // Не ддавай мене хутко...». У вясельнай песні «чорна ўтаўка» выступае прыроднай паралеллю і маці, і бацькі нявесты: «Ой, у річцы да ў болотцы // Чорна ўтаўка крачэ. // Ой, послухай, молода (імя), // Як по тобі маты плачэ. // — Нэхай плачэ, як собі хочэ, // Я юй одробыла, // Я юй у клітцы і ў повітцы // Сэрпыка повісіла. // Ой, ў річцы да ў болотцы // Чорна ўтаўка крачэ. // Ой, послухай, молода (імя), // Я по тобі батько плачэ. // — Нэхай плачэ, як собі хочэ, // Я ёму одробыла, // Я ў клуньцы ў сторунцы // Грабэлькы повісіла» [Забараўцы Пінскага р-на]. У іншай вясельнай песні селезень сімвалічна карэлюе з жаніхом, а вутка — з яго маці: «Із-пуд сыття, з-пуд ракыття // Выплівае сывы сэлезень, // А за ім ёго ўтоўка. // А з-пуд двур’я, з-пуд нового // Выежджае, выежджае молоды (імя), // А за ім, за ім ёго матэнька: // — Со́жды, по́жды, мой сыночок, // Рошчэшу тобі твоі кудэркы. // — Ой, вэрныса, моя мамочка, // Рошчэшэ мні млода (імя)» [Забараўцы Пінскага р-на]. У песнях з адмоўным паралелізмам выкарыстоўваецца канструкцыя «то не вутка, а родная матулька». Гэтая канструкцыя можа дапаўняцца наступнай: «то ж не селязенька, а мой татулька». У калядках вутка з «селязенечкам» і «вуцянятамі» — гэта гаспадары з дзецьмі. Шэрая вутачка, што плыве па мору, асацыюецца з ***маладой удавой*** ці ***смутнай маладой замужніцай***, жыццё якой у чужой сям’і даволі складанае. У адной з купальскіх песень свякроўка прымушае нявестку «у суботу позна работку рабіць, плацейка мачыць, ў нядзельку рана плацейка жлукціць, на моры бяліць», на што маладзіца адказвае, што яна «не вутачка па мору плаваць». Дарэчы, у кантэксце пранямыцця вобраз качкі ўзнікае ў парэміях тыпу «У літо і качка — прачка» [Моталь Іванаўскага р-на].

Дастаткова ўніверсальнай з’яўляецца сімвалізацыя вуткай ***прыгожай дзяўчыны шлюбнага ўзросту, нявесты***, у прыватнасці ў каляндарна-абрадавых і вясельных тыпу: «Заквакала сывонька ўтонька на моры, // Отозвалася молодая Галенка в коморы. // — Ой, чы е, чы е муй батынько на дворы, // Чы выкупыть молоду з ныволі? // — Ны выкуплю тыбэ, мое дітятко, ныколы, // Жывы, мое дітятко, дэ тобі Господь позволыв. // Заквакала сывонька ўтонька на моры, // Отозвалася молодая Галенка в коморы. // — Ой, чы е, чы е муя мамонка на дворы, // Чы выкупыть

молоду з ныволі? // — Ны выкуплю тыбэ, мое дітятко, ныколы, // Живы, мое дітятко, дэ тобі Господь позволыв» [Хомск Драгічынскага р-на]. «Утонька значная» — гэта прыгожая нявеста: «— Ой, на дэнь добрый, добрые люды, нам до вас, // Чы ны прыплыла наша й утонька тут до вас? // — А якая й ваша утонька, якая? // — Наша й утонька мыж вашымы значная: // Чорное крыльцэ, білое пэрцэ — такая. // — Ой, на дэнь добры, добрыі люды, нам до вас, // Дэсь заблудыло наше й дітятко тут до вас. // — Ой, яко ей ваш эй дітятко, якое? // — Наше й дітятко мыж вашымы значное: // Білое лычко, чорное очко — такое» [Тэльмы Брэсцкага р-на]. Наступанне селезнем на крыло вутачкі сімвалізуе залёты хлопца да дзяўчыны. Адпаведна селезень — прыродная паралель жаніха. Значымым зместам у такіх кантэкстах надзяляецца апярэнне птушкі, яго якасць, колер.

Лімінальны стан дзяўчыны-нявесты можа актуалізавацца праз вобраз «вутачкі-пераплывачкі»; яе перамяшчэнне праз мора карэлюе з пераходам нявесты ў дом жаніха, у іншы стан. Песенная карціна пераплывання шэрай вуткі з возера ў мора сімвалізуе незваротны пераход нявесты ў хату жаніха, «з раскошы ў гора». Вутка з абскубаным пер'ем, «укарочаным» крыллем абазначае пераходны стан нявесты, каса якой расплецена ці падрэзана. Жаночая сімволіка качкі актуалізуецца і ў народных тлумачэннях сноў (калі цяжарная прысніць качку — народзіць дзяўчынку), а таксама ў прыпеўках на любоўную тэматыку: «Коля, Коля, что наделал — // В саде уточку убил, // Ты ласкал меня словами, // Сам другую полюбил» [Камароўшчына Камянецкага р-на]. Звычайна гэты артнітавобраз у прыпеўках фармалізуецца: «Я не утка, я не гусь, // По воде плавать боюсь. // Проведи меня домой, // Я одна идти боюсь» [Вялюнь Брэсцкага р-на]; «Вышивала полотенце // Уточкой и петушком. // Вытирайся, мой милёнок, // Утречком и вечерком!» [Прыбарава Брэсцкага р-на]. Вобразы качак (качораў, вутак, вуцят) фармалізуюцца таксама ў песнях тыпу: «По сынёму моры // Плаваюць качоры, // Ужэ твої, Марылё, // Проходят вычоры. // По сынёму моры // Плаваюць утята, // Ужэ твої, Іванэ, // Проходять дывчата» [Кругель Камянецкага р-на].

У казках гусі, гусі-лебедзі ці самы «задрыпаны з гусяточок-лебедяточок» надзяляюцца функцыяй ***медыятара***, пераносяць героя з «чужога» свету ў свой, вяртаюць дадому. Прывядзем запісаную ў наш час казку: «До бабы прыйіхав внук — отдыхаты чы як. І він любыв рыбу ходыты ловыты. Підэ, баба йысты наварыць, бліноў нажарыць ёму, і ідэ ёму йысты нэсэ. Івашік там, на озерэ, плавае. «Івашік мой, унучычэк, плывы-плывы до бэрэшка. Каша масляна, мука красняная, а місочка білэсэнька, а рубашэчка краснэсэнька». Він прыплывэ, як почуе бабін голос, прыплывэ і прідэ, пойість і зноў пойіхав рыбачыты. Тут обнаружыла Баба Яга і прійшла. І грубым голосом давай: «Івашік мой, унучычэк... «А він почув, і эта: «Чую-чую-чую. Это нэ бабін голос, я нэ прыплыву». Вона пошла до коваля, а коваль ёй зробыв такі голос, як у бабы. І она прішла і ту пісню давай співаты. І він прыплів. І она ёго украла в мішок і понесла. Нэсэ-нэсэ, нэсэ-нэсэ, алэ в тулэт схотілосо і она пошла под кустік. А той Івашік выліс. (Камнём ёго прыдавыла і думала, шо нэ вылезэ.) І він втік. Втік на высокэ дерево. А та баба прішла — і нэма ёго. А він зліз на высокэ дэрэво і сідыть, і боіца злазыты. А то як раз была Паска. А тут дід з бабою: «Ну німа, про-

пав внучык». Яйца ділять: «Цэ тобі, діду, а цэ мені, а вместо Івашіка — котіку». А тем временем лэтелі гусі, і він спрашуе: «Гусяточка-лебедяточка, возьміть мэнэ на крыляточка, однэсіть мэнэ до батычка, а в батычках всёго доброго, да нэ трошкі». А воны кажуць: «Там будэ лэтэць таке задрыпанэ, то він тэбэ і возьмэ». І так він ёму заспівав ту песню, і взяв він. І прылітів там, де баба з дідом жылы, посадів ёго — в трубу сунув. А колы воны яйца дэлылы, він почув (Івашік з трубы) і кажэ: «А мені» (повторыв некалькі раз). Воны як почулы голос, то давай... Разобралы піч, Івашыка вытяглі і помылы» [Тамашоўка Брэсцкага р-на].

Сувязным паміж рознымі светамі выступае і селезень, якому прыпісваюцца «быстры крыллі і высокі палёт», маладзіца — гераіня жніўнай песні — просіць у яго пераляцець праз шырокае поле, глыбокае мора і прынесці бацькаву негу ў свёкраў дом.

Пер'е з качкі можа фігураваць у якасці ***вясельнага атрыбута***, паводле песні яго ўторкваюць у жаніхову шапку. У каравайнай песні «уткі, шышкі» для ўпрыгажэння каравая павіны патрапіць у чалавечы свет з сакралізаванай ракі: «Завінь, завінь тыкі вітёр із Дунаю, // Выкынь, выкынь нам уток, // Шышок до караваю» [Здзітава Бярозаўскага р-на]. Сапраўды, «качкі» («гускі») з цеста ўпрыгожвалі вясельны каравай. У песнях са шлюбнымі матывамі качкі («вутачка-крачка») разам з іншай хатняй жывёлай згадваюцца як частка ***пасаду нявесты***. У шчадроўках сем селязнёў, сімвалічна звязаных з ідэямі ***плоднасці, дабрабыту*** і прызначаных кожнаму з сямейнікаў, знаходзяцца ў сумцы гаспадара, якога славяць шчадроўнікі.

Качкі могуць фігураваць у аповедах пра назвы ландшафтных аб'ектаў, у прыватнасці імя качара выступае матывацыйнай асновай утварэння назвы возера: «Было озеро, в нем утки. Главного самца звали Сэлях. От него и пошло название Селяхи» [Тамашоўка Брэсцкага р-на]. У малых жанрах, у прыватнасці, загадках, асаблівую маркіраванасць набывае характэрная хадзьба качкі: «На лапатках ходзіць»; узгадаем таксама выслоўе: «ходзіць як качка». Пастаяннай апазнавальнай характарыстыкай качкі з'яўляецца таксама спецыфічная дзюба-«шупля».

Качка (вутка) і селезень (качар), такім чынам, — семіятычна нагружаныя вобразы беларускага фальклору, хоць дыяпазон варыятыўнасці іх сімволікі ў параўнанні з шэрагам іншых арнітавобразаў не вызначаецца шырынёй. З вобразамі качкі і качара звязаны адпаведна жаночая і мужчынская сімволіка, ідэі пераходнасці, плоднасці, сямейнасці. У песнях праз актуалізацыю арнітавобраза чалавек атрымлівае лірыка-паэтычнае асэнсаванне і ў сваёй цялеснай індывідуальнасці, і як выканаўца пэўнай сацыяльнай ролі, член калектыву. У паэтычных формулах з разгледжаным вобразам выяўляюцца інтымна-ласкальныя адносіны да лірычнага героя, шырокая гама яго перажыванняў, настрой, вызначаецца «сваё» і «чужое» ў розных сферах сацыяльнага быцця. Сімвалічнае значэнне атрымлівае выгляд качкі, а таксама спосаб перасоўвання, выдаванне гукаў. Пры гэтым самая галоўная яе рыса — лакалізацыя на вадзе (моры), з чым звязана семантыка медыятыўнасці.

Іна ШВЕД,
доктар філалагічных навук,
прафесар кафедры беларускага
літаратуразнаўства
БрДУ імя А.С. Пушкіна

Міфасемантыка птушак у традыцыйнай карціне свету беларусаў: голуб



Міфасемантыка птушак у традыцыйнай карціне свету беларусаў: голуб.

Голуб у народных уяўленнях — *святая, божая* птушка. Беларуская (шырэй — славянская) традыцыя проціпастаўляе голуба драпежным чорным птушкам, а таксама *нячыстым* жывёлам. Так, беларусы лічаць, што, калі на Каляды назавеш ястраба і крумкача *галубамі*, то яны не зробяць шкоды гаспадарцы. У сувязі з святасцю птушкі існуе забарона на ўжыванне голуба ў ежу, бо забітая птушка складае лапкі накрыж, як складаюць рукі нябожчыку. Такія паводзіны даюць падставу меркаваць, што ў яго душа падобная да чалавечай [1; с. 612].

У народнай традыцыі Берасцейшчыны вобраз голуба апавіты шэрагам міфаў. У традыцыі Бярозаўскага раёна яны звязаны найперш з біблейскім сюжэтам: «*Ніколі жылі людзі, а потом вжэ быв потоп, і потым шукалі людзі той каўчэг, вон зроблены з такого дрэва, шо вон нэ загнів. І тогды той Ной, вон людэй взяў у той ковчэг і два голубкі. І вось яны плылі, скрозь була вода, нэдэ сушы нэ було — заліло водою, потом вжэ ж вон значыт выпускаў тыя галубкі, яны полеталі ды зноў прылецелі на той каўчэг селі, бо нэма сушы. Шы воны далей плылі і зноў вон выпусціў тые галубкі, але воны вжэ нэ вэрнуліса, ды понялі воны вжэ, шо суша е. І вжэ много тысяч лет пройшло после того потопа*» (ФЭАБ; Агароднікі). Лічыцца, што менавіта голуб прынёс галінку алівы на Ноеў карабель, даючы знаць, што з'явілася зямля, якую можна засяляць [2]. Падобны сюжэт існуе і ў паўднёваславянскай традыцыі, у якім тлумачыцца паходжанне колеру лап птушкі: голуб вярнуўся ў каўчэг з чырвонымі лапамі, бо на зямлі ўступіў у кроў. У славянскай народнай культуры бытуюць легенды, дзе голуб ўдзельнічае ў стварэнні свету: да аддзялення зямлі ад вады «Бог быў голубам». У іншых легендах два голуба, якія сядзяць на якары сярод мора, спускаюцца на дно мора і дастаюць адтуль пясок і камень, з якіх былі створаны зямля і нябесныя свяцілы [1; с. 612]. У такіх кантэкстах голуб функцыянуе як дэміург, набывае касмаганічную значнасць, падтрымлівае пэўны светапара-

дак. На нашу думку, гэтая сімволіка мае архаічныя карані.

Характарыстыку вобраза голуба дапаўняюць і мусульманскія легенды, у якіх тлумачыцца «гаворка» птушкі. Згодна адной з іх, голуб атрымаў ад Алаха дар гаварыць і, даведаўшыся пра хуткі голад, паляцеў папярэдзіць людзей з крыкамі «Купляй хлеб!». У пакаранне Алах пазбавіў голуба здольнасці гаварыць, і з тых часоў птушка ўмее толькі крычаць «Купляй хлеб!» Мусульманскія легенды растлумачваюць і паходжанне чорнай палоскі вакол шыі голуба. Так, чорная паласа з'явілася ад вяроўкі, на якой голуб насіў кацёл з вадой для мыцця Мухамеду. Славяне звязваюць з'яўленне чорнай палоскі з паходжаннем голуба ад краўца — ад яго нітак застаўся след на шыі птушкі [1; с. 614].

Для голуба найбольш характэрна любоўна-шлюбная сімволіка, якая прадстаўлена ў прыкметах, у вясельным абрадзе, а таксама ў песенным фальклоры, дзе раскрываецца мужчынская сімволіка голуба і жаночая галубкі. Так, голуб з галубкай ці *два голубяты* — характэрныя персанажы вясельных песень, дзе абазначаюць жаніха і нявесту, прыкладам: «— *Ой, выйды, выйды, матэнька, із хаты, // Бо прыехала два голубяты. // Однэ — рождённэ, другэ — суждёнэ, // Пэрэд вечером воно звінчанэ*» (ФЭАБ; Вяйцяшын, Бярозаўскі р-н).

Мужчынская сімволіка голуба выразна выяўляецца ў прыпеўках тыпу: «*Низенько голубь летает — // Крылышки подбитые. // Ходит милый по деревне — // Кудерьки навитые*» (ФЭАБ; Вялікая Калінніца, Баранавіцкі р-н).

Голуб — даволі частотны вобраз матрыманіяльных прыкмет: «*Колы белы голуб лэтае каля хаты, то в той хате скоро свадьба будэ, о*» (ФЭАБ; Сялец, Бярозаўскі р-н). Адзначым, што белы колер у беларускай традыцыйнай карціне свету асацыюецца з жыццёвай сілай, вытворчым патэнцыялам, нараджэннем новага [3; с. 124], а таксама з рытуальнай чысцінёй і лімінальным станам. Пазітыўная ацэнка голуба выявілася ў намінацыях лагоднага, добрага, прыгожага чалавека голубам ці галубкай (у залежнасці ад полу). Так, у хрэсьбінных песнях кум выказвае свае прыязныя адносіны да кумы (яе душы і цела), называючы яе галубачкай: «*Ой, кумачка, да галубачка, люблю тваю душу. // Ой, за тваё да здароўечка да я выпіці мушу*» (ФЭАБ; Камароўшчына, Камянецкі р-н).

У традыцыйнай свядомасці голуб часта выступае як увасабленне, іпастась душы памерлага. Лічыцца, што з нябожчыка вылятае душа «шызым голубам». Прычым аблічча белых галубоў прымаюць «чыстыя» душы, а «нячыстыя», злыя душы пераўтвараюцца ў крумкачоў. З уяўленнем пра голуба як чалавечую душу звязаны звычай карміць парадзіху голубам ці курыцай, бо такая жанчына, паводле народных уяўленняў, «пустая», душу ў яе забрала дзіця [1; с. 616].

Паводле народных аповедаў, голуб з'яўляецца ў момант чыёй-небудзь смерці і, верагодна, забірае душу чалавека ў іншасвет: «*Помню, што, когда умирала моя мама, то на дерево возле дома прилетел голубь. Я тогда не обратила внимание. Когда мама умерла, то голубь улетел. Старые люди говорят, што ето предок приходил за мамой. Он забрать её туда пришел*» (ФЭАБ; Сялец, Бярозаўскі р-н). Гэтая птушка можа ўспрымацца як медыятар, які толькі прыносіць вестку пра смерць: «*У нас йе така прiказка, шо як голуб сядзе на подоконнiк, то будзе весть, шо нíхто умрэ ці ужэ умер. Так і было: ото заметіла, шо голуб сіў на окно, то сё. Через некоторэ*

время лібо по телефону, лібо так, дазнаюс, шо нéхто умёр. Боязно, бо збываецца усё время» (ФЭАБ; Альшаны, Столінскі р-н). У сувязі са сказаным характэрна, што ў галашэннях сын-нябожчык уяўляецца ў іпастасі голуба: «*Ах, сыночак мой, галубочак мой, // Пташачка пералётная. // Так рана ўлятаць сабрайся, // З дзеткамі і жонкай папрашчайся. // Ах, сынок, ах, галубок, // Што ж ты надумайся?*» (ФЭАБ; Моўчадзь, Баранавіцкі р-н).

Аднесенасць голуба да *чыстых, святых* птушак матывуе ўзнікненне ахоўнай, апатрапейнай функцыянальнасці гэтай птушкі. Так, лічыцца, што голуб ахоўвае ад бяды: «*Вот, если голубь поселится на доме или еще где-нибудь, то тот дом обойдут всякие беды. Считается, что он как бы охраняет ту семью*» (ФЭАБ; Селаўшчына, Бярозаўскі р-н).

Як і для многіх іншых птушак, для голуба характэрна метэапрагназуючая функцыя, якая прадстаўлена ў прыкметах, звязаных з апазіцыяй «добрае надвор'е/непагадзь» (ясна/дождж): «*О бачыш, шо голуб пер'е чысціць, то будэ дошч*» (ФЭАБ; Сялец, Бярозаўскі р-н). Метэапрагноз рабіўся на аснове назіранняў за паводзінамі птушкі: «*А колы голуб у добру погоду ховаецца, то гэто тоже до дожду*» (ФЭАБ; Сялец, Бярозаўскі р-н).

У заключэнне адзначым, што семантычна нагружаны, міфалагічна афарбаваны вобраз голуба прысутнічае не толькі ў берасцейскім фальклоры, але і ў этнакультуры многіх народаў свету з рознымі рэлігійна-міфалагічнымі традыцыямі. У большасці кантэкстаў птушка адносіцца да «чыстых», «боскіх» істот, пазначаных «партнёрскай» блізкасцю з чалавекам, яго душой. Для голуба з яго «чалавечым прошлым» характэрна матрыманіяльная сімволіка, якая актуалізуецца ў вясельных песнях і прыкметах. Пара галубоў часта сімвалізуе шлюбную пару, гарманічныя ўзаемаадносіны закаханых людзей. Характэрным для семіятызацыі разглядане птушкі з'яўляецца ўяўленне пра яе як увасабленне душы, што пэўным чынам адбілася ў магічных працэдурах, скіраваных на набыццё душы. Метэапрагназуючая функцыянальнасць голуба прадстаўлена ў прыкметах, якія звычайна будуюцца на апазіцыі «добрае надвор'е/непагадзь». Голуб таксама звязаны з касмаганічнымі матывамі і народнабіблейскімі аповедамі пра выратаванне Ноя і засяленне зямлі пасля патопу.

Вольга ГРОНСКАЯ,
студэнтка філалагічнага факультэта
БрДУ імя А.С. Пушкіна



Спіс літаратуры:

- Гура, А.В. Символика животных в славянской народной традиции / А.В. Гура. — М. : Индрик, 1997. — 910 с.
- Салавей, Л. Голуб / Л. Салавей, М. Антропаў, Т. Валодзіна // Міфалогія беларусаў: энцыклапедычны слоўнік. — Мінск : Беларусь, 2011. — С. 121.
- Швед, І.А. Міфалогія колеру ў беларускай традыцыйнай духоўнай культуры : манаграфія / І.А. Швед ; Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна ; навуковы рэд. А.С. Ліс. — Брэст : БрДУ, 2011. — 211 с.

БАЦЬКОЎСКІМІ СЦЕЖКАМІ



Фоторепортаж

Остромечевские просторы,
и не только, привлекли внимание участников фольклорно-краеведческой экспедиции — 2017

Почти ежегодно редакция альманаха «Астрамечаўскі рукапіс» совместно со студентами-филологами Брестского государственного университета им. А. С. Пушкина отправляется в увлекательное путешествие по Брестскому региону. Происходит это в рамках летней учебной практики студентов и в плане сбора фактологического материала для очередных выпусков районного краеведческого альманаха. Традиционно возглавляют творческую группу доктор филологических наук профессор Инна Швед, она же — научный консультант издания, и редактор Брестского краеведческого альманаха Александр Волкович. Забегая вперед скажем, что в нынешнем году успешному проведению экспедиции во многом способствовала активная позиция администрации ОАО «Остромечево» во главе с директором О. А. Бураком и заместителем директора Ж. С. Горустович. Они сделали максимум возможного, чтобы обеспечить группу транспортом и горячим питанием. И сделали это вполне















26

бескорыстно, в качестве действенной шефской помощи. Ведь ни для кого не секрет: альманах «Астрамечаўскі рукапіс» за пятилетие своего существования стал настоящим культурным брендом Брестского района, гордостью и своеобразной «фишкой» передового хозяйства ОАО «Остромечево», имиджевым фактором одноименного агрогородка.

Не менее важным оказалось то, что группу в подготовительный период поддерживали, а затем сопровождали на каждом этапе следования по остромечевским просторам, селам и весям ответственные, знающие люди из числа работников хозяйства, Лыщицкого сельсовета, старосты деревень, сотрудники отдела культуры райисполкома.

Не подвела и погода. Погожие, теплые деньки, воцарившиеся в регионе, добавляли хорошего настроения, бодрости, работоспособности.

Что же интересовало участников экспедиции в первую очередь? Легче ответить, что оставляло равнодушным — ничто... Производственная деятельность ОАО «Остромечево» — и ухоженные поля, и хозяйственные постройки. Техника на полях и дорогах, и старинные хаты, и колодцы в маленьких деревнях. Обихоженные современные церкви — и предметы сельского быта ушедшей эпохи. И, конечно же — люди. Старожилы. Свидетели и творцы биографии нашей страны, нашей Берестейщины. Местные дедушки и бабушки с их бесконечными воспоминаниями, рассказами, откровениями. Людские биографии и судьбы. Песни, народные приметы, присказки, были. Неповторимый местный говор и быт вполне современных деревень, сохранивших приметы и признаки ушедших эпох...

Казалось бы, фольклорная экспедиция по Остромечевскому «кусту» проходит не первый раз, как будто бы все уже изъезжено да исхожено, ан нет! Криницы народной культуры поистине неисчерпаемы! Много поучительного, полезного и уникального удалось почерпнуть из задушевных бесед с жителями деревень Большие и Малые Зводы, Кустынь, Люта, Цюприки, Рудавец и других. Буквально в любом дворе, куда мы заглядывали, гостей радушно встречали, делились сокровенным, наболевшим. Правильно ведь говорят, что пожилым людям очень и очень важно общение, внимание со стороны, готовность посторонних людей выслушать, понять, записать, сфотографировать. Поэтому нам охотно показывали крестьянские хаты и хозяйственные постройки, семейные альбомы, сохранившиеся орудия сельского быта, рушники, вышивки и многое-многое другое, что осталось не только забытым атрибутом, но частью жизни, заветным воспоминанием, кусочком чьей-то судьбы... Что могли — дарили, позволяли увезти с собой. Например, станут экспонатами учебно-фольклорной лаборатории университета подаренные жителями старинный «куфр», приспособления для обработки льна, глиняные горшки, вилы, тяпки, керосиновые лампы, подковы... Именно то, что современная молодежь воочию редко когда видела и знает лишь по кинофильмам да книжным иллюстрациям.

А рассказы и откровения жителей, народная мудрость сельчан будут воспроизведены в очередных номерах нашего альманаха.

Еще раз огромное спасибо остромечевцам, открывшим приезжим свои сердца и души!

Бывайце здаровы, жывіце багата!

Александр ВОЛКОВИЧ

Суворовский колодец

Участники фольклорно-краеведческой экспедиции побывали возле так называемого «Суворовского колодца» на окраине деревни Рудавец.



Существует этот колодец примерно две сотни лет. Глубина скважины — до десяти метров. Стены выложены из бутового камня, того самого, разновидности которого в изобилии устилают окрестные поля. Местные жители традиционно использовали камни ледникового происхождения в качестве строительного материала. А, как известно, бетонированных колодезных кругов, в нашем понимании, в старину не было.

Название колодца принято связывать со знаменитым походом Суворова по усмирению участников восстания Тадеуша Костюшко на территории Речи Посполитой в 1794 г.

Сопровождавшая экскурсию директор районного Дома ремесел Татьяна Лукьянюк рассказала, что старый дом с колодцем когда-то принадлежал крестьянину по фамилии Бонадык (имя — производное от «Бенедикт») Кухарук. Строение и делянка по наследству перешли его сыну Павлу Семаку, а от него — сыну Василию, умершему в 2015 г. Дочери Василия Семака, Надежда и Антонина, в настоящее время проживают в Бресте, частенько навещают родовое гнездо.

Данный объект включен в историко-краеведческий, туристический маршрут «Живородящие криницы этноса», разработанный Татьяной Лукьянюк.

Александр ВОЛКОВИЧ





СКАРБНІЦА НАРОДНЫХ ТАЛЕНТАЎ



Вышивка по дереву? Да

Редкое ремесло освоила мастерица из деревни Радваничи Алла ПАНАСИК.



Несколько энергичных нажатий тонким сверлом, пару ловких движений иглой — и деревянное полотно в умелых руках мастерицы оживает. Черные, красные, белые нити расцветают традиционными для прибужской земли орнаментами, и непримечательная дощечка превращается в рушник удивительной красоты.

До недавних пор об уникальной технике — вышивке по дереву — знал довольно узкий круг людей. Однако в прошлом году за возрождение необычного ремесла взялась радваничская мастерица Алла Панасик, о чем сразу же заговорили и средства массовой информации. До этих пор вышивкой по дереву в нашей стране занималась только минчанка Анна Барашкова, которую в свое время вдохновили работы литовской умелицы.

Увлеклась новым для себя видом рукоделия Алла Панасик совершенно случайно. Во время сбора материалов для этнографического музея в Радваничском Доме культуры местная жительница рассказала ей о том, что у ее бабушки была вышитая табуретка, которая, к сожалению, не сохранилась. Аллу Антоновну, хорошо знакомую с различными видами народного творчества, крайне заинтересовал этот факт, ведь до этого ни с чем подобным в своей практике она не сталкивалась. После небольшого «расследования» выяснила, что техника эта насчитывает не одно столетие и в свое время считалась вершиной мастерства. Привилегией иметь предметы, украшенные таким способом, обладали представители высшего сословия и богатые люди. К сожалению, со временем о вышивке по дереву незаслуженно забыли.

Очарованная красотой и самобытностью этого искусства, Алла Панасик решила его возродить: сначала освоила сама, а затем стала обучать ему радваничских школьников. Большую поддержку мастерице оказал председатель профсоюза ремесленников Брестской области Жан Васько.

Следует отметить, что разнообразие «полотен» для вышивок не ограничива-



ется только деревом, используются также глина и металл, на первый взгляд, совершенно неприспособленные для таких целей. Однако принцип работы с этими материалами универсален и на деле не так сложен, как кажется.

— На деревянных заготовках я прорисовываю схему и просверливаю отверстия, после чего обрабатываю изделие наждачной бумагой и покрываю лаком. Это, пожалуй, самый трудоемкий этап работы. Далее сквозь дырочки продеваются нитки, как при обычной вышивке крестиком, — объяснила процесс изготовления Алла Антоновна.

Наблюдать за тем, как на твердой поверхности рождаются затейливые узоры, от которых исходят особое тепло и мягкость, — увлекательное занятие. Но вместе с тем от мастерицы оно требует скрупулезности, усидчивости и внимания.

Сегодня в коллекции радваничской рукодельницы — более двух десятков изделий, декорированных вышивкой: шкатулки, сундучки, обереги, разделочные доски и другие предметы кухонной утвари, а также интерьера. Первыми предметами, украшенными в такой технике, стали деревянная ложка и настенные часы, которые она вышила по схеме XVIII века.

В последнее время работы Аллы Панасик можно часто увидеть на районных и областных выставках. Многие думают, что узоры к деревянной поверхности приклеены, но убедившись в том, что это действительно вышивка, удивляются и стараются выведать у рукодельницы секрет необычного мастерства. Алла Антоновна всегда с радостью делится своими знаниями, а тех, кто загорелся желанием постичь азы этого ремесла, приглашает к себе в гости в Радваничи.

Алеся ПАШКЕВИЧ
Фото Сергея ХМЕЛЯ





И душу вкладывая в шедевры

Не так давно исполнилось 70 лет замечательной женщине Валентине Климук. В честь ее юбилея в сельском Доме культуры агрогородка Вистычи прошло красочное мероприятие, на котором собрались друзья и знакомые Валентины Алексеевны.

Женщина проработала всю жизнь в ОАО «Агро-сад Рассвет». Сначала трудилась на должности экономиста, была освобожденным председателем профкома, а потом бухгалтером. Сейчас Валентина Алексеевна на заслуженном отдыхе. Вместе со своим супругом Иваном Феодосьевичем воспитали двоих сыновей. Сейчас у нее еще есть и двое внуков.



Эта уверенная и привлекательная женщина вступила в клуб пожилых людей под названием «Гармония», в котором можно найти занятие на любой вкус: рукоделие, фотодело, компьютерная грамотность и пилатес. Но больше всего Валентина Алексеевна любит вышивать картины.

— Вышиваю с детства, — рассказывает юбиляр. — В мою коллекцию входит более 100 работ. Это и картины, и рушники, и пасхальные салфетки. Очень люблю дарить родным и близким свои работы, а иногда бывает, что делаю их на заказ.

Следует заметить, что к знаменательной дате в жизни мастерицы в местном Доме культуры открылась персональная выставка картин Валентины Алексеевны под названием «Вдохновение». На вернисаже для всеобщего обозрения их было представлено около 20. Такие работы, как «Сельский дворик», «Олень», «Волшебные подарки», «Осень», «Украинский домик» и другие, наполнены душевной теплотой и необычайной любовью к людям и животным. Кстати, рукодельница записывает,

сколько дней и часов потребовалось, чтобы вышить картину, и поэтому она знает, что, например, «Сельский дворик» вышивала 22 дня, над картинами «Мальчик и девочка» и «Праздничное Рождество» трудилась 5 дней, «Рождественская ночь» заняла 8 дней, а вот «Дед Мороз на лыжах с праздничными подарками» покорился за 2 дня.

Конечно, ни один праздник не обходится без гостей. Поздравить с юбилеем самобытную мастерицу пришла заместитель директора ГУ «Территориальный центр социального обслуживания населения Брестского района» Татьяна Савоневская. Она подарила Валентине Климук подарок, сделанный руками ребят из центра.

— Реализовывать свои таланты, делиться мудростью с детьми, внуками, наслаждаться полноценной повседневной жизнью, общением с приятными людьми, созидания в духовном и материальном, здоровья и долгих лет жизни, — пожелала юбиляру Татьяна Викторовна.

Заместитель главного бухгалтера ОАО «Агро-сад Рассвет», председатель ветеранской организации и староста агрогородка Вистычи Людмила Титова вспомнила совместную работу в местном хозяйстве с Валентиной Алексеевной.

— Вы — человек талантливый, трудоспособный, целеустремленный, и нам, работникам ОАО «Агро-сад Рассвет», всегда хотелось равняться на вас, — уточнила Людмила Станиславовна. — Хочу пожелать самого главного — крепкого здоровья, а также, чтобы радовали вас ваши дети, внуки и скорее появились правнуки.

Примечательно, что Людмила Титова от ветеранской организации подарила Валентине Климук подписку на еженедельник «Заря над Бугом».



Высоко оценила творчество виновницы торжества председатель районного комитета профсоюза работников АПК Елена Просмыцкая, отметив, что все представленные на выставке картины — это произведения искусства.

— Хочу вам вручить, Валентина Алексеевна, Почетную грамоту от райкома профсоюза работников АПК за многолетний добросовестный труд на предприятии ОАО «Агро-сад Рассвет», большой личный вклад в профсоюзное движение, — сказала Елена Станиславовна.

Еще один существенный штрих. На протяжении всего вечера задавала нужный тон мероприятию женская вокальная группа «НЕвозраст», художественный руководитель которой Ольга Врублевская.

Бесспорно, Валентина Алексеевна — очень оптимистичный и открытый человек. Видно по всему, что она ценит жизнь и любит то, чем занимается. А самое главное — в ней есть душевность и простота, которые прослеживаются в каждом ее вышитом шедевре.

Светлана САВЧУК
Фото автора

Как оживает войлок в руках мастерицы из Бреста



Наталья Глевацкая убеждена: из шерсти можно сделать все, что угодно — от грубых массивных валенок до воздушного крошечного ангела.

Любовь к рукоделию передалась Наталье по наследству. Доказательства тому развешаны по всей квартире мастерицы: гобелен на всю стену — дело рук прабабушки, кружева — плод творчества бабушки Клавдии, живописные картины — напоминание об отце.

— Я тоже всегда шила, вязала, вышивала... А потом у меня появилась собака по имени Кир — имя дали императорское. Постоянно вычесывала его, в руках оставалось много шерсти. Слышала, что из собачьей шерсти делают пояса и наколенники, которые якобы обладают лечебными свойствами. Они помогают при болезнях суставов — это мне еще мама рассказывала. Выбрасывать ценный материал было жалко, решила попробовать свалять простейшие изделия.




Знакомство с войлоком переросло в крепкую дружбу, которая длится вот уже семь лет. Теперь Наталья дает мастер-классы по этому виду творчества, участвует в выставках, областных и республиканских фестивалях ремесел, является членом областного клуба мастеров народного творчества «Скарб».

Так называемый войлочный бум пришел к нам относительно недавно, в начале 2000-х, и информацию по этому виду творчества приходилось по крупицам собирать в интернете.

— Движение пришло к нам из России. Там этот вид творчества возродил Александр Пилин — всемирно известный мастер войлоковаляния, член Международной ассоциации войлока, благодаря ему популярность этого материала начала набирать обороты. Он развивает новые технологии войлоковаляния и проектирования изделий текстильного дизайна, — рассказала Наталья.

Еще одной трудностью, с которой пришлось столкнуться мастерице в начале ее творческого пути, стало отсут-



ствие подходящего материала. Ведь войлок белорусского и российского производства, по словам Натальи, подходит не для всех работ — тонких элементов из нашей шерсти сделать не получится.

— Мое спасение в этом плане — живущая в Германии дочь. У нас продается грубая шерсть — 23–25 микронов, а там можно купить шерсть толщиной 14 микронов. Из нее получаются более пластичные и тонкие вещи.


В доказательство тому Наталья начинает доставать из разных уголков квартиры многочисленные изделия и поделки из войлока. Из шкафов — одежду: жакеты, пальто, шляпки и блузы. С книжных полочек — фигурки животных и людей. Со стен снимает красочные картины. Некоторые из них поражают не только размерами, но и авторской задумкой. Триптих «Семья» — необычный взгляд Натальи на главные жизненные ценности: на боковых картинах — по массивной птице, они охраняют свое общее «сердце», которое Наталья изобразила на центральном полотне. Здесь на фоне алых сплетений разместилось большое гнездо с будущими птенцами.

Восхищает филигранностью деталей и гигантский одуванчик, белые «парашютики» которого выглядят настолько правдоподобно, что, кажется, при малейшем движении воздуха разлетятся по всей квартире.

Неподалеку «расхаживает» большой важный петух. Этот символ наступившего года помню еще с недавней областной выставки «У пошуках спрадвечнага-2».

Со слов мастерицы узнаю, что войлоковаляние таит в себе уйму возможностей:

— Не знаю вещи, которую нельзя было бы сделать из этого материала. Главное — освоить три вида техники: мокрого валяния, сухого и нуновойлок. Первая из них наиболее традиционна. В технике мокрого валяния, при помощи воды и мыла, наши предки делали валенки. Для второй характерно использование игл с зазубринами — войлок «набивается» ими. Нуноваляние поя-



вилось относительно недавно... «Нуно» по-японски «ткань». Соединяется ткань и шерсть, ткань как бы вваливается в шерсть.

Войлок — поистине уникальный материал. Изделия из него невероятно легкие и прочные — нитки при создании одежды из войлока Наталья не использует. Еще один плюс — антибактериальность войлока, в нем не заводятся болезнетворные микробы и грибки плесени. Также этот материал невероятно износостойкий — недаром его используют в автомобилестроении, мебельном производстве, строительстве.

В этом виде творчества Наталья неустанно совершенствуется: техника нуновойлок позволяет экспериментировать — сочетать войлок с синтетикой, шелком, хлопком. Плюс к этому мастерица недавно освоила искусство экопринта, и теперь есть возможность разнообразить ткань отпечатками листьев и цветов, полученных при помощи соков самих растений, без использования искусственных красителей.





Находясь на заслуженном отдыхе, мастерица имеет уйму времени для реализации творческих идей. Своими работами Наталья радует не только друзей и близких, многие из них украшают областные и республиканские выставки.

Недавно войлочные изделия Натальи пополнили ряды персонажей батлейки, которую в конце 2016 года по инициативе заведующей отделом традиционной культуры областного общественно-культурного центра Ларисы Быцко возрождали в агроусадьбе «Стулы». Воздушные невесомые фигурки животных и людей в исполнении мастерицы никого не оставляют равнодушными — и дело не только в приятной текстуре материала и мастерстве обращения с ним. Каждая вещь — воплощение души и настроения ее хозяйки, способной «оживлять» своей богатой фантазией даже неодушевленный материал.

Юлия ОЛЕЩЕНЯ
Фото автора

ЛІТАРАТУРНАЯ СЯДЗІБА




US-BELARUS
OBSERVER
25 years
of Diplomatic Relations
WHAT IS THE BELARUSIAN SOUL?

Духовный мост между народами

Вышел очередной номер журнала «US-BELARUS OBSERVER», издаваемого на английском языке в США под эгидой Международного фонда Духовная Дипломатия Почетного консула Беларуси Майкла Моргулиса. Среди множества интересных статей 50-ти страничного красочного, отлично иллюстрированного журнала — статья члена Союза писателей Беларуси, нашего земляка Александра Волковича. Называется она (в русскоязычном оригинале) «Что такое белорусская душа?».

Таким образом, сделан очередной шаг на пути укрепления взаимопонимания и дружбы наших народов, позиционирования Беларуси в мировом сообществе как открытой, дружелюбной страны, готовой сотрудничать со всеми странами, в том числе, с США на принципах равноправия и уважения суверенитета каждого. Отрадно, что брестские писатели, люди других творческих профессий вносят свою скромную лепту на этом многотрудном пути.

Русскоязычный перевод статьи Александра Волковича и фотокопии прилагаются.

Что такое белорусская душа?

И душа, и судьба народа всегда связаны с землей, на которой он живет.

Писатели всех времен уже давно заметили самобытность и особенность этого края. Польский историк М. Довнар-Запольский в 1919 году отмечал:

«Благодаря своей исторической и этнографической особенности белорусы представляют собой наиболее чистое славянское племя, принявшее и внешний вид славянина и много его особенностей психики и быта».

А великий русский писатель И. Бунин, гостивший у своего друга в Витебской губернии в 1913 году, так записал в своем дневнике:

«У крестьян этой полосы, по моему мнению, в наиболее чистом виде сохранились неиспорченные черты славянской расы. В них видна порода. Да и живут они хорошо, далеко не в тех ужасных некультурных условиях, как наш мужик в средней России».

Географическое положение белорусской земли определило судьбу ее народа. Моя страна находится на прямом пути из Западной Европы к Москве, и поэтому все захватнические войны, которые вели в XIX и XX веках западные страны (Франция и Германия) против России всегда проходили по территории Белоруссии и разорили ее вконец.

Только в последней Второй мировой войне погиб каждый третий белорус.

Такие невыносимые страдания и потери, какие вынес белорусский народ в годы этой войны, мало кому из народов выпадали в истории XX века.

Только к 1985 году Белоруссия восстановила свою довоенную численность населения.

Это ее вечная память и боль.

Об этом много и сильно написано в белорусской литературе — в книгах Алеся Адамовича, Василя Быкова, нобелевского лауреата Светланы Алексиевич и др.

У белорусского народа до сих пор нет вкуса к богатству, к стяжательству. Ему никогда не удавалось ничего накопить и сохранить. Бесконечные войны сравнивали с землей деревни и города, уничтожали все богатства. Белорусскому народу бесконечно дорог мир, порядок и свобода.

Сегодня Беларусь — это сильная и процветающая республика. Минск — один из самых благополучных и красивых городов страны. Конечно, в деревнях по-прежнему жизнь труднее, но крестьяне не ропщут — они благодарны за мирную жизнь и честно трудятся. В городах Белоруссии чисто, на улицах порядок, нет пошлых рекламных щитов, нищие не роются в помойках.

В последние годы получило невероятное развитие сельское хозяйство, организованы современные сельскохозяйственные акционерные общества, построены животноводческие комплексы, агрогородки, осушены болота, крестьяне научились получать на своих в основном скудных землях высокие урожаи. И при этом — село не умерло, ибо именно в сельской местности — истоки национального языка, культуры, вековых традиций народа, его духовности.

Душа белорусов — это венок из луговых цветов, плывущий по течению спокойной утренней реки. Это зовущий костер на берегу. Это загадочный цветок «папараць-кветки», — цветок счастья, который ищут в ночь на Ивана Купалу белорусские девчата, очарованные старинным преданием.

Душа белорусов — это старинный орнамент, вытканный и вышитый на обережном рушнике, где в графических узорах и символах зашифрован код жизни человека на земле.

Душа белорусов — это зорка Венера над родительской стрехой и светлячки лампадок в Красном углу с иконой Божией Матери, это перезвон колоколов в престольные праздники родных сел, местечек и городов.

Душа белорусов — это пергаментные фолианты древних рукописей и церковных книг, главная из которых — первокнига белорусской нации Библия Франциска Скорины.

Душа белорусов — это старинные храмы и замки, хранящие память веков, это подорожные кресты и памятники павшим на обочинах главных и проселочных дорог, которые считаются нашими жизненными и духовными ориентирами.

Это наши задушевные песни, что поет над детской колыской уставшая мать, горланят на деревенских свадьбах подвыпившие мужики, это жалобный плач над могилами соотечественников и предков.

Это заповедный шум Беловежской и Налибокской пущ, переливы Днепра, Немана и Припяти, это ожерелья тысяч озер, нанизанных на ниточки бесчисленных рек, речушек и ручейков, это ладони заливных и хлебных полей, перины лесов и дубрав.

Трудно не влюбиться в нашу открытую, красивую душу, похожую на чистое и белое руно ягненка! Ведь недаром мою страну называют Белой Русью. Приезжайте — убедитесь сами.

Александр ВОЛКОВИЧ,
белорусский писатель

Поэтычныя глыбіні паэткі з «глыбінкі»



Галіна Бабарыка нарадзілася ў вёсцы Мачуль Столінскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1975 годзе закончыла Мачульскую васьмігадовую школу, у 1979 годзе — Магілёўскае педагагічнае вучылішча, у 1987 гозде — Магілёўскі педагагічны інстытут. Чатыры гады працавала на Магілёўшчыне, ужо трыццаць чатыры — у роднай школе. Мае вышэйшую катэгорыю. За дасягнутыя поспехі ў навучанні і выхаванні ў 1991 годзе ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета.

Пісаць вершы пачала ў дзесяцігадовым узросце. Друкавалася ў раённай газеце, газеце «Піянер Беларусі», «Зорька», часопісе «Бярозка». З 1979 па 1983 гады часта друкавалася ў газеце «Новае жыццё» Клімавіцкага раёна. З 2000 года актыўна займаецца літаратурнай творчасцю. Паэт, празаік. У Саюз пісьменнікаў Беларусі прынята ў 2007 годзе па рэкамендацыі Уладзіміра Карызны. Вершы, апавяданні, публіцыстыка друкаваліся ў часопісах «Маладосць», «Вясёлка», «Роднае слова», «Алеся», «Гаспадыня», «Пачатковая школа»; у газетах «Голас Радзімы», «ЛіМ», «Звязда», «Настаўніцкая газета», «Беларуская ніва», «Преображение», а найчасцей — у газетах «Народная трыбуна», «Зара» і раённай газеце «Навіны Палесся». Выдала два паэтычныя зборнікі: «Давер» (2004) і «Дарога ў восень» (2015). Сааўтар калектыўных зборнікаў «Беларускі ручнік», «Па праву жывога», «ЛітАўра», «Сіла слабасці» і інш.

З'яўляецца лаўрэатам Міжнароднага літаратурнага конкурсу «Сям'я — Адзінства — Айчына» (2014). Узнагароджана граматамі Саюза пісьменнікаў Беларусі і Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта за плённую працу ў літаратуры, значны ўклад у прапаганду творчасці пісьменнікаў Берасцейшчыны і актыўную грамадскую дзейнасць. Узнагароджана падзячнымі пісьмамі аддзела адукацыі Столінскага райвыканкама за эфектыўную работу па павышэнню якасці філалагічнай адукацыі (за працу з вучнямі ў аб'яднанні «Мастацкае слова») і рэдакцыі раённай газеты.

Жыве і працуе ў вёсцы Мачуль.

Вершы Галіны Бабарыкі

Мова народа

Чыстая, добрая, звонкая,
Шчодрая, быццам любоў,
Мова. Над роднай старонкаю
Мала гучыць яе слоў.

Роднай зямелькі выгнанніца,
Стала чужой для сваіх,
Толькі ж яна не пажаліцца,
Шэпча старонкамі кніг.

Часам ваеннай навалы
Клікала ворага біць
Голасам Янкі Купалы,
(Ён з ёй умеў гаварыць!)

Жывіцца мова крыніцай
Слоў, што ідуць ад зямлі:
Ранкам, святлом, навальніцай,
Зернем на свежай раллі.

Ясная і мілагучная
Мова твая, беларус,
Ты не саромся — агучвай:
Бохан, гарлачык, абрус.

Дзверы, сцяжынка, рамонкі,
Травы ў іскрынках расы...
Чуеш, у назвах старонкі
Продкаў тваіх галасы.

Мова народа павінна
Годна гучаць у вяках.
З кнігі Францыска Скарыны —
Нашай пісьменнасці шлях.

Шлях беларускага слова,
Крок да бяссмерця яго.
З кнігі працягвае мова
Шлях да народа свайго.

Адыход восені

Вецер кудзелю аблокаў прадзе,
Лісце скідае пад ногі,
Гоніць, як ветразь, па стылай вадзе,
Мосціць лістотай дарогу.

Дождж — як праз сіта, шэрасць і змрок,
Смутак ва ўсім наваколлі...
Гэта прырода дае нам урок —
Жыць, калі сіл няма болей.

Жыць — калі радасна, жыць — калі боль,
Жыць — як надзеі не будзе:
Час адыходу, зямную юдоль
Вызначыць Бог, а не людзі...

Восень сыходзіць у дальні абшар,
Плача яна прад сыходам.
Быццам лістоту, лісты каляндар
Скіне да новага года.



***

П'ю паветра чыстае, гаючае,
Радуюся сонечнаму дню,
І душой спяваю неўміручаю:
Гэты свет люблю, люблю, люблю.

Хоць жыццё зямное і нясветлае,
У яго ўрастаю, як раллю,
І жар-птушку, мару запаветную,
Спадзяванняў крошкамі кармлю.

Ах, мае вы мары недасяжныя,
Зноў далёка — толькі крок зраблю.
Для душы, напэўна, вы няважныя,
І дарэмна вас кармлю, лаўлю...

Гэты свет нядоўга спадарожнікам
Будзе для цябе і для мяне,
Вернемся ці кветкаю, ці дожджыкам,
Каб аддзячыць роднай старане.

Ліпа

Пахучым пышным залатым букетам
На ўскрайку роднага сяла
Яшчэ на ўзлёце сонечнага лета
Чароўна ліпа зацвіла.

Снуюць, звіняць кампаніяй вясёлай
Уранку і спякотным днём
Ля жоўтых кветак працаўніцы-пчолы,
Каб нас парадаваць мядком.

Таўсманы чмель, таксама завітаўшы
На пах, які чуваць вакол,
Нектар духмяны ўволю паспытаўшы,
Не хоча адставаць ад пчол.

Гудзе «букет»... Чаруе водар летні...
Збіраем, быццам пчолкі, мы
У ліпы-гаспадыні той прыветнай
Дарунак лета для зімы.

Узімку лекі-чай заварым з кветак,
І дом сцюдзёнаю парой
Напоўняць пахі ліпы, пахі лета,
Цудоўны прынясуць настрой.

Азарэнне

Восені пагодлівай усмешкі...
Цёплая ружовасць верасоў...
Клічуць грыбнікоў дарожкі-сцежкі
Ў царства мацакоў-баравікоў.

Сыплюць векавечныя дубровы
Ў познюю атаву жалуды.
Дрэвы апранаюцца ў абновы,
Колер даспадобы ім руды.



Пацеркі калючае шыпшыны,
Ягад і арэхаў ураджай —
Восень сустракае нас гасцінна:
Толькі падарункі сабірай.

Голас устрывожаны над полем
Вецер падхапіў, далей панёс —
Зверху азіраючы раздолле,
Жораў абдымае сінь нябёс.

Далеч аздабляюць павуцінкі —
Восень, як пайсці ў далёкі шлях,
Хоча супыніцца на часінку,
Прывязаць каня свайго ў лугах...

Кожнай клеткай радасць адчуваю,
Веры азарэнне, пачуццё:
Свет, які нясе адбітак раю, —
Прыступка ў далейшае жыццё.

Звычайны дзень

Праменьчык цёпла прывітаўся з клёнам,
На міг заблытаўся ў кроне,
Пасля пабег за сонечнаю хваляй,
Што паплыла ў зямную далеч.

Мяжа святла і ценю па абшарах
Усё далей. Мінае хмара.
Прастор пад васільковым парасонам
Ляжыць бурштынава-зялёны.



Чакае свет вячэрняй прахалоды.
Гусей крыклівыя чароды,
Шукаючы ў стаўку сабе ратунак,
Глядзяць на лужу з яўным сумам...

І дождж прыйшоў, нябесным шляхам,
У шыбы стукаў і па даху,
Змятаў, змываў струменямі пылоту
І гнаў нясцерпную спякоту.

Адходзіў дзень... Звычайны, як мільёны...
Дажджом натоленыя гоні
Страсалі кроплі дажджавыя з лісця...
Усё паўторыцца калісьці:

Спякотны дзень і дождж, і ночкай зорнай
Гараць каралі ў рэчцы соннай...
Ісці жыццю ўсё тымі ж берагамі...
Паўторыцца... Без нас ці з намі...

Няпростая ісціна

Не праклінайце. Бога не гнявіце.
Усё расставіць. Зробіць так як след.
А ворагам... даруйце, іх любіце —
Такі ў жыцці няпросты запавет.

Ідзе твая малітва да нябёсаў
З падзякаю. Няхай не лепшы лёс...
Няхай жыцця бялюткія палосы
У чорных пасках, як ствалы бяроз...

Але ж жывеш: людзей не вінаваціш,
У дні звычайным бачыш прыгажосць,
Не крадзеш у суседзяў радасць, шчасце,
Бо кожны ў гэтым свеце толькі госць.

У кожнага свой лёс, гадзіннік лічыць
Яго жыцця хвіліны ці гады...
Не маем права і дазволу іншым
Жадаць нягоды, болю і бяды.

Не праклінайце. Бога не гнявіце,
Бо вернецца пракляцця бумеранг.
Не зло, спагаду да людзей нясіце.
Дабро — душы бяссмертнай крыж і сцяг.



***

Парашуцікі з таполі
У нябёсах сініх, чыстых
Усё плывуць-плывуць над полем
Так спакойна, урачыста.

Адбірае сілы спёка...
Каб, здаецца, на хвілінку
Паляцець сабе ў вандроўку
Белай, лёгкай аблачынкай.

Ад зямлі не адарвацца,
Да яе мы ўсе прыкуты —
І ляжаць пакуль без працы
Нашы крылы-парашуты.

Невядома, колькі часу:
Колькі зімаў, колькі летаў
Ім ляжаць яшчэ ў запасе,
Пагарджаным гэтым светам.

Толькі светлаю душою
У кароткіх снах дзіцячых
Узлятаем над зямлёю
І сябе ў нябёсах бачым.

Маці

Самы родны чалавек у свеце...
Любіць нас такіх, якія ёсць...
Ад калыскі ласку дорыць дзецям,
Аддае здароўе, маладосць...

Мы раслі — і зналі толькі шчасце:
Ад бяды, калі прыходзіў час,
Засланяла, бараніла маці
І рукамі, і малітвай нас.

Час ішоў — шырэлі далягляды,
І дзяцінства бесклапотны шлях
Знік у віхрах новых лістападаў
Недзе там, на іншых берагах.

Ды жанчына ў розных іпастасях
Там гасцюе многа-многа год
То бабуляй, прабабуляй-маці,
Што турбуецца пра ўвесь свой род...

Пах лякарстваў пасяліўся ў хаце...
Ды не за сябе яна часцей
Просіць у Прачыстай, Божай маці,
Заступіцца за яе дзяцей.



«На небоскребах аисты не живут»

Как художница из Нью-Йорка иллюстрировала книгу белорусского писателя о Беловежской пуще



Имя этой замечательной художницы я узнал из интернета, а ее рисунки впервые увидел в одном литературном альманахе, изданном в Германии и пересланном мне по почте немецкими друзьями. Прежде всего, привлекла творческая манера художницы. Пишет она (в частности, книжную графику) пером, черной тушью, легкими воздушными линиями. За внешне скромной простотой и каллиграфической точностью рисунка скрывается глубокий поэтический образ и смысл.

Как раз в это время я работал над книгой о Беловежской пуще, и мне очень не хватало иллюстраций, сделанных в данной манере. Почему? Ответ простой: Беловежская пуща с ее легендами, тайнами и редкими лесными обитателями, удивительной флорой и фауной всегда привлекала внимание писателей, художников, фотографов, историков. А в своей книге под названием «Алеся. Беловежские сны» я и рассказывал об одной из таких легенд.


Вскоре выяснилось, что живет моя художница в Нью-Йорке, звать ее Ланой (сокращенное от Светланы), фамилия по мужу — Райберг, по матери — Рачковская. И представьте, как я обрадовался, когда узнал, что родилась Лана-Светлана в моей любимой Беларуси, в Минске!!! В Америке проживает с 1992 года, преподает изобразительное искусство в школах Нью-Йорка. На родине Лана закончила художественно-графический факультет Витебского пединститута. Училась в том самом городе, с названием которого связано имя знаменитого на весь мир художника Марка Шагала! И так же как ее великий предшественник, посвятила свою жизнь любимому делу — живописи!

Первый вопрос, заданный мне Ланой в письме из-за океана, звучал так: «О чем Ваша книга?»

Я отправил ей текст заглавной повести. В ней была рассказана красивая легенда о юной девушке, живущей в скромной избушке на краю маленькой деревни в глубине заповедной Беловежской пущи. На крыше избушки и на больших деревьях построили многочисленные гнезда белые аисты. Это настоящая аистиная деревня. Такая деревня

в пуще существует в реальности, называется Бабинец, но не об этом речь. У девушки была больная ножка, и она лечила ее, наступая босой стопой на священный камень с отпечатком следа Богородицы. Камень со следами Богородицы лежит в окрестностях пущи, и люди устраивают к нему паломничество. Девочка дружила с прирученным ею диким Зубром и разъезжала верхом на нем с колокольчиком в руке. Зубра и Хромоножку сопровождали лесные голуби и ласточки. Заповедный лес и сила дикой природы придавали ей мужества и уверенности... И чудо свершилось — девушка выздоровела...

Лана увлеченно принялась рисовать, однако вскоре от нее пришло письмо... Художница огорченно призналась, что за время жизни в огромном мегаполисе за океаном она забыла, как, к примеру, выглядят... листья лесного папоротника. Какие рога у зубра... Как растут ветви векового дуба... Каким





образом расправляет крылья летящий аист, и как при взлете и посадке...

«Ведь на небоскребах аисты не живут...», — оправдывала художница свою первоначальную неудачу.

Тогда я стал отправлять в Нью-Йорк фотографии с видами Беловежской пущи. Много-много фотоснимков дикой природы: деревья, птицы, растения, животные...

Успех не заставил себя долго ждать. Лана-Светлана все вспомнила, во всем разобралась, сделала иллюстрации и отправила мне.

Вскоре книга о Беловежской пуще с рисунками Ланы Райберг вышла в нашем местном издательстве.

Ко всему рассказанному добавлю, что Лана Райберг по приезду в Нью-Йорк изучила американскую систему образования в Университете Искусств Филадельфии. Является членом Лондонского Объединения Художников Воображения и Бруклинской Ассоциации Художников. Состоит в Клубе Писателей Нью-Йорка. Издала несколько книг прозы. Сын Андрей учился в Сан-Франциско на иллюстратора. Делает обложки к музыкальным альбомам. А Лана в настоящее время полностью посвятила себя живописи.

Александр ВОЛКОВИЧ

Журналіст, гісторык, пісьменнік



Анатоль Расціслававіч БЕНЗЯРУК — беларускі журналіст, гісторык, пісьменнік. Нарадзіўся ў вёсцы Бастынь Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і настаўнікаў. Скончыў Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы (1994) і Інстытут жырналістыкі БДУ (2010). Працуе загадчыкам аддзела пісьмаў і сацыяльных праблем раённай газеты «Сельская праўда». Жыве ў Жабінцы.

Першыя публікацыі Анатоля Бензерука пачалі з'яўляцца ў перыядычных выданнях з 1985 года. За кнігу «Свята для сэрца» ў 2009 годзе ўганараваны літаратурнай прэміяй імя Уладзіміра Калесніка, стаў лаўрэатам рэспубліканскага конкурсу «Лепшы твор 2009 года» ў галіне дзіцячай літаратуры (2010). Аповесць Анатоля Бензерука «Мячы Грунвальда, альбо Дванаццаць абаронцаў караля» ў лютым 2013 года адзначана на нацыянальным конкурсе «Мастацтва кнігі» дыпломам І ступені і ганаровым знакам «Залаты фаліянт» у намінацыі «Літфармат».



За працы па краязнаўстве і ахове гісторыка-культурнай спадчыны Анатоль Бензярук узнагароджаны прэміяй Брэсцкага фонду Тадэвуша Касцюшкі (1996), Ганаровай граматай Брэсцкага аблвыканкама (1998), Граматай Міністэрства культуры (2003).

А. Бензярук — пераможца абласнога конкурсу журналісцкага майстэрства на Брэстчыне ў намінацыі «Ахова гісторыка-культурнай спадчыны» (2011), дыпламант конкурсу «За актыўную творчую дзейнасць у Год кнігі» (2013). Улетку 2014 года атрымаў званне «Ганаровы член Саюза пісьменнікаў Беларусі».

Анатоль БЕНЗЯРУК

Хто вы, спадар Нэма?

Краязнаўчыя нататкі

Рэвалюцыйныя падзеі, якія ў пачатку XX стагоддзя ахапілі абшары, уключаныя ў межы Расійскай імперыі, садзейнічалі абуджэнню нацыянальна-вызваленчага руху на беларускіх землях. Вялікую ролю ў гэтым адыграла газета «Наша Ніва», якая выходзіла ў Вільні. Ужо ў першым нумары ад 10(23) лістапада 1906 года выдаўцы абяцалі «служыць усяму беларускаму скрыўджанаму народу», быць падобнымі на люстэрка жыцця, ад якога свет павінен падаць у цемру. Таму аўтарытэтнае беларускамоўнае перыядычнае выданне ў хуткасці атрымала заслужанае прызнанне. Амаль у кожным кутку Беларусі «Наша Ніва» займела сваіх добразычлівых прыхільнікаў, што дасылалі ў рэдакцыю шматлікія паведамленні і допісы.

Быў гэткі карэспандэнт і ў нашых мясцінах. Пісаць у тыя часы ў беларускую газету было небяспечна, таму аўтар друкаваўся пад псеўданімамі Нэма, N, NN, H, што значыць Невядомы.

Першыя яго звесткі пра жыццё на Берасцейшчыне (прынамсі, на тых землях, што зараз уваходзяць у склад Жабінкаўскага раёна) былі надрукаваны напрыканцы 1907 года. Спачатку Нэма паведаміў пра агляд народнай бібліятэкі ў Крупчыцах (сёння гэта вёска Чыжэўшчына, вядомая знакамітай бітвай часоў Касцюшкаўскага паўстання).

У сваіх нататках карэспандэнт падкрэсліваў: «***Рэвізія рабілася пасля даносаў людзей, каторым не спадабалася праца дзеля прасьветлення народа. Чыноўнік, разглядзеўшы спіскі кніжок, прызнаў, што кніжкі Дастаеўскага, Талстога, Караленка (хаця ўсе дазволены цэнзурай) не павінны быць у бібліятэках для народа; заведуючых бібліятэкамі пастрашыў, што іх пакараюць за тыя кніжкі***». (Захоўваем тагачасную арфаграфію «Нашай Нівы»).

У наступным газетным нумары Нэма расказаў, як у ноч на 20 лістапада цэлая шайка з 18 чалавек напала на маёнтак Ацячызна (зараз у складзе аграгарадка Ленінскі паблізу шашы Брэст — Мінск — мяжа Расійскай Федэрацыі). Уладар маёнтка панёс вялікія страты, паколькі было «***захвачана 7000 руб. грашыма; зьберэгацельная кніжка государственного банка на 25000 руб. і квітанцый казначэйства на 5000***».

Асаблівую ўвагу таямнічага карэспандэнта выклікалі паведамленні пра культурнае жыццё краю. Так, ён расказаў чытачам, як 6 хлопчыкаў і 2 дзяўчыны з вёскі Астрамечава задумалі ўтварыць самадзейны тэатр. Яны вывучылі п’есу Івана Катлярэўскага «Наталка-Палтаўка», прасякнутую любоўю да народа і сапраўдным вясковым гумарам. Астрамечаўцы паехалі ў Брэст, каб паглядзець ігру сапраўдных акцёраў, «***і добра ўсё зразумелі, як зрабіць тэатр***». 20 ліпеня 1908 года самадзейныя выканаўцы прыехалі ў Арэпіцкае народнае вучылішча, дзе

адбылося прадстаўленне. Нэма зазначыў, што на спектаклі было надзвычай шмат народу.

Апошняе паведамленне з нашых мясцін карэспандэнт змясціў у кастрычніку 1908 года. Яно тычылася аднаго з найстарэйшых жыхароў Жабінкаўшчыны: *«У Можэйкі Кобрынскага п(авета) жыве стары дзед Сьцяпан Кабец, ён мае 111 гадоў, але еще моцны чалавек, яго нават выбралі апекуном (папечыцелем) Сьцепаноўскай цэрквы. Дзядуля любіць вельмі расказваць, як ён гаварыў с царом Александрам I».*

Нэма быў не адзіным, хто дасылаў у Вільню звесткі пра жыццё нашага краю. У жніўні 1908 года нейкі «Халімон з-пад Пушчы» паведаміў пра адкрыццё ў Хмелеўскай народнай школе новай бібліятэкі, якая ўзяла імя Фларыяна Паўленкава. Справы рускага кнігавыдаўца Фларэнцыя Фёдаравіча Паўленкава (1839–1900) былі шырока вядомы ў межах Расійскай імперыі. Пасля ягонай смерці ўтварыўся фонд, які клапаціўся пра народную адукацыю. Як пісалася ў артыкуле «Нашай Нівы», прысвечаным адной з гэткіх бібліятэк: *«З розных канцоў Беларусі даходзяць да нас весьці, што народ, прачнуўшыся ў завірусе апошніх гадоў ад доўгага сну, пачынае разумець вялікае значэньне навукі і цягнецца к сьвету яе».*

Сетка бібліятэк пашыралася і ў нашым краі. Паміж 1908 і 1914 гадамі на Жабінкаўшчыне ўзніклі чытальні ў вёсках Азяты, Багуславічы, Булькова, Бусні, Вежкі, Мажэйкі, Пруск, Пшанаі, Рагозна, Сакалова, Старое Сяло, Стрыганец, Сцяброва, Сцяпанкі, Сяхновічы. Агульна ў іх меліся звыш 12 тысяч кніг. Самая старажытная на нашых землях бібліятэка для пісьменных



ХЛЯБЦЭВІЧ Яўген Іванавіч
(псеўд. Халімон з-пад Пушчы)

сялян дзейнічала з 1893 г. пры Вежкаўскім народным вучылішчы.

Думаецца, нашым чытачам будзе цікава даведацца, хто ж тыя загадкавыя карэспандэнты, якія першымі змяшчалі на старонках газеты весткі пра наш край.


Псеўданім Нэма ўзяў сабе сын айца Леаніда, святара Астрамечаўскай царквы, Мікалай Раманоўскі. (Дарэчы, менавіта ён супольна з братам Сяргеем, як стала вядома дзякуючы росшукам краязнаўца Аляксандра Ільіна, заснаваў паўленкаўскую бібліятэку ў Астрамечаве).

А вось «Халімонам з-пад Пушчы» называла сябе яшчэ больш вядомая асоба — блізкі сябар Янкі Купалы Яўген Іванавіч Хлябцэвіч (1884–1953), які пры жыцці дапамагаў песняру, а пасля трагічнай Купалавай гібелі беражліва захоўваў ягоныя славу і светлую памяць.

«Ваше Величество случай»

Куцко Иван Владимирович родился в 1997 году в агрогородке Вулька-Обровская Ивацевичского района Брестской области. Окончил Вулька-Обровскую среднюю школу, где и начал писать стихи. Интерес к поэзии подогревал учитель русского языка и литературы Андрей Васильевич Бинкевич.

После окончания школы поступил в Брестский государственный технический университет на факультет «Инженерных систем и экологии» по специальности «Водоснабжение, водоотведение и охрана водных ресурсов». В БрГТУ занимается в литературной студии «Лира» под руководством Татьяны Юрьевны Шульги.



Лауреат Брестского областного поэтического конкурса «Мы рождены для вдохновенья», в номинации «Этот мир придуман не нами...» (2017 г.)

***

Ваше Величество случай,
Я хотел пригласить Вас на чай!
Случай, заходи, не мучай!
Что не прибрано — извиняй!
Если б знал я, что ты соизволишь
Зайти, то прибрался б, поверь!
Я надеюсь, что ты мне позволишь
Поделиться парой идей!
Ты приходишь не специально —
Чрез случайностей карусель,
Меняя собой колоссально
Судьбы разных по сути людей.
Я надеюсь, наступит время,
День чудесный, как вот теперь!
Ветром, может быть,
теплым, весенним
И мою ты откроешь дверь!

Новая экология Алексея Скакуна



Алексей Степанович Скакун. Хозяйственник. Ученый-аграрник. Писатель. Личность знаковая и легендарная. История Прибужья, передового хозяйства ОАО «Остромечево» и одноименного агрогородка неразрывно связаны с именем этого незаурядного человека.

На протяжении всей своей богатой событиями и трудовыми свершениями биографии Алексей Степанович не расстается с фотоаппаратом. Неповторимая хроника будней и праздников земляков предстает на снимках, сделанных фотохудожником Скакуном.









С особым трепетом мастер относится к природе родного края. Хлебные поля и сеножати, восходы и закаты, уютные уголки родного Прибужья с их реками и озерами, животным и растительным миром привлекают его пристальное внимание, а, запечатленные на снимках, остаются со всеми нами навсегда.

Даже выйдя на заслуженный отдых, Алексей Степанович не расстается с фотоаппаратом. Он очень любит бродить по окрестностям деревни Клейники, где в настоящее время проживает с семьей, по околицам ближайших населенных пунктов. В одной из таких «вандровок» в объектив попала придорожная табличка-указатель с белорусским названием деревни НЭПЛІ. «А если расшифровать название по





буквам?!» — задумался Скакун. И первое словосочетание, пришедшее на ум, оказалось: «НОВАЯ ЭКОЛОГИЯ ПРИРОДЫ ЛЕСНОЙ ИНДУСТРИИ». Согласитесь: знаково, символично!


Для Скакуна — эта аналогия не просто игра значений и слов. Заинтересованный разговор продолжился у него в Клейниковском сельском совете, при встречах со старожилами, с местной молодежью. Речь, конечно же, шла о бережном отношении к богатствам родного края, к любимой природе.

Уверен также, что такого рода открытия, встречи и беседы бесследно не проходят. Для всех нас.

Александр ВОЛКОВИЧ



КНІЖНАЯ ЗАЛА




«На роднай мове кніжнай святы чытаўся змест...»

«...Мы — духоўныя і гістарычныя нашчадкі тых пакаленняў, якія стагоддзямі марылі пра сваю суверэнную дзяржаву. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці заўсёды была няпростай. Але імкненне нашага народу жыць у сваім доме было стрыжнем, які даваў сілу і мацаваў яго дух. Мы помнім пра тых асветнікаў і спадзвіжнікаў дзяржаўнасці, якія стаялі ля яе вытокаў. Гэта нашы знакамітыя землякі: Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Францыск Скарына, Сымон Будны і многія іншыя гістарычныя асобы.»

Александр ЛУКАШЭНКА

Ураджэнец старажытнага Полацка, выдатны філосаф, асветнік, гуманіст, пісьменнік, вучоны эпохі Адраджэння Францыск Скарына ўвайшоў у гісторыю як «бацька» ўсходнееўрапейскага кнігавыдання: менавіта ён у 1517 годзе ўпершыню выдаў Біблію на старабеларускай мове для «людзей паспалітых да добрага навучання». Сваім жыццём і дзейнасцю ён падвёў сваеасаблівы вынік развіцця ўсходне-славянскай культуры за пяць стагоддзяў, што прайшлі ад прыняцця хрысціянства, і выступіў наватарам, даў новы напрамак, які арыентаваўся на агульначалавечыя каштоўнасці.



Францыск Скарына — «сын з слаўнага града Полацка»

Нарадзіўся Францыск Скарына каля 1490 года ў сям'і купца Лукі (Лук'яна) у горадзе Полацку, які ў той час з'яўляўся адным з буйнейшых палітычных і культурных цэнтраў Вялікага Княства Літоўскага.

Пачатковую адукацыю юны Францыск атрымаў у бацькоўскім доме, дзе спасцігаў азы чытання і пісьма, а затым вывучаў лацінскую мову ў школе пры Полацкім бернардзінскім манастыры, заснаваным у 1498 годзе па ініцыятыве вялікага князя Аляксандра Ягелона.

У 1504 годзе «сын з слаўнага града Полацка» паступіў у адзін з лепшых еўрапейскіх універсітэтаў таго часу — Кракаўскі — на факультэт «вольных мастацтваў» і праз два гады атрымаў сваю першую вучоную ступень — бакалаўра філасофіі.

У студэнцкія гады сярод захапленняў Францыска была і медыцына: згодна з данымі біёграфаў, праз некалькі гадоў у сценах alma mater ён атрымаў ступень магістра, а ў 1512 годзе — бліскуча здаў экстэрнам экзамен доктара медыцыны ў Падуанскім універсітэце.

Аб прыродных здольнасцях і стараннасці маладога вучонага хадзілі легенды, а ў актавых запісах адзначаецца, што «сын спадара Лукі Скарыны з Полацка праявіў сябе пахвальна». І сёння партрэт беларускага доктара можна знайсці ва ўніверсітэцкай галерэі сярод іншых выпускнікоў, знакамітых вучоных з розных еўрапейскіх краін.

Згодна з адной з версій, у 1512–1516 гадах Францыск Скарына служыў асабістым лекарам і сакратаром сына літоўскага караля Жыгімонта І Старога — княжыча Яна, з якім пазнаёміўся яшчэ ў час навучання ў Балонскім універсітэце.

Вытокі кнігадрукавання: першая Біблія на старабеларускай мове



Выдавецкую дзейнасць Францыск Скарына пачаў у Празе, дзе пры падтрымцы купцоў-мецэнатаў з Полацка і Вільні заснаваў друкарню, а ўжо 6 жніўня 1517 года апублікаваў «Псалтыр» у перакладзе на старабеларускую мову, які стаў першым выданнем у гісторыі нацыянальнага і ўсходнеславянскага кнігадрукавання.

Усяго ж на працягу двух гадоў у пражскай друкарні ўбачылі свет 23 кнігі Бібліі, якія суправаджаліся ілюстрацыямі (ксілаграфічнымі гравюрамі, ініцыяламі і застаўкамі), а таксама аўтарскімі прадмовамі і каментарыямі, у якіх Францыск Скарына дзяліўся з чытачамі сваімі асветніцкімі ідэямі і поглядамі.

У пачатку 1520-х гадоў Францыск Скарына пераехаў у Вільню і адкрыў першую друкарню на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага. Менавіта тут выйшла «Малая падарожная кніжка», дапоўненая акравершамі і календаром сонечных і месячных зацьменняў, і «Апостал», які расказвае аб дзеяннях і пасланнях бліжэйшых вучняў Хрыста.

«Малая падарожная кніжка» прызначалася для падарожнікаў і ўключала 18 царкоўных кніг, у лік якіх увайшлі «Псалтыр», «Часасловец», «Шасціднявец» і «Саборнік», а таксама акафісты і каноны... Унікальныя выданні невялікага фармату былі ўпрыгожаны гравюрамі, застаўкамі і ініцыяламі, а дзевяць з іх суправаджалі пасляслоўі.



Кніжная спадчына Францыска Скарыны

Дзякуючы асветніку і першадрукару Францыску Скарыну беларускае нацыянальнае кнігавыданне ўзбагаціла не толькі еўрапейскую, але і агульнасусветную культуру. Рэнесансныя выданні знакамітага палачаніна вызначалі высокая якасць друку, характэрныя мастацкія, гравюрныя і арнаментальныя ўпрыгажэнні, шрыфты і іншыя кампаненты выдавецкай эстэтыкі.

Адной з галоўных асаблівасцей усіх кніг Скарыны сталі аўтарскія каментарыі, якія дапамагалі «паспалітым» людзям лепш зразумець змест, асэнсаваць значэнне падзей, адлюстраваных у кнігах Свяшчэннага Пісання.

У красамоўных прадмовах, якія адлюстроўваюць гуманістычныя ідэалы і светапогляд Францыска Скарыны, прасочваюцца прыкметы іншых літаратурных жанраў, якія пазней атрымалі працяг у беларускай літаратуры і пісьменстве.



Кнігі Францыска Скарыны распаўсюджваліся ў шматлікіх рукапісных копіях, і сапраўды не толькі паўплывалі на развіццё духоўнай культуры беларускіх зямель, але і ва ўсім Вялікім Княстве Літоўскім, іншых усходнеславянскіх краінах, стымулявалі ўзнікненне кнігадрукавання ў Маскоўскай дзяржаве.

Апошнія гады жыцця: падарожжы і ўрачэбная практыка

Апошнія гады жыцця Францыск Скарына прысвяціў медыцынскай практыцы. У 20–30-х гадах XVI стагоддзя ён выконваў абавязкі лекара і сакратара ў віленскага біскупа Яна, а ўжо ў 1529-м па запрашэнні прускага герцага Альбрэхта Гогенцолерна наведаў Кёнігсберг, дзе ўспыхнула эпідэмія.

У сярэдзіне 1530-х ужо вядомы пры чэшскім двары па ўдзеле ў дыпламатычнай місіі Жыгімонта I Францыск Скарына прыняў прывабную прапанову ад караля Фердынанда I і стаў прыдворным лекарам і садоўнікам у раскошным батанічным садзе, які абрамляў велічны замак Градчаны.



Мемориальная доска в Вильне, на доме, где находилась типография Скорины

Памёр Францыск Скарына каля 1551 года, аднак дакладная дата смерці і месца пахавання невядомы. Яго сын Сімяон у 1552 годзе атрымаў прывілей ад чэшскага караля Фердынанда I на права на спадчыну нябожчыка доктара «Францыска Руса» з Полацка.

Францыск Скарына і сучаснасць

Памяць Францыска Скарыны, імя якога стаіць у адным радзе з такімі выдатнымі дзеячамі сусветнай культуры эпохі Адраджэння, як Леанарда да Вінчы, Рафаэль і Ян Амос Каменскі, увекавечана ў назвах вуліц многіх беларускіх гарадоў, універсітэта ў Гомелі, а таксама помніках, адным з якіх з'яўляецца бронзавая скульптура першадрукара каля Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

У краіне заснаваны дзяржаўныя ўзнагароды — ордэн і медаль Францыска Скарыны, якія ўручаюцца за ўклад у развіццё і прымнажэнне духоўнага і інтэлектуальнага патэнцыялу, культурнай спадчыны народа; асаблівыя заслугі ў гуманітарнай і дабрачыннай дзейнасці, поспехі на ніве нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння...

Сёння спадчына Францыска Скарыны налічвае 520 кніг, многія з якіх знаходзяцца ў Расіі, Польшчы, Чэхіі, Германіі. Усяго ж выданнямі беларускага першадрукара валодаюць каля 50 краін, у тым ліку і яго радзіма — Беларусь — 28 экзэмпляраў.

У 2017-м годзе, які прысвечаны 500-годдзю беларускага кнігадрукавання, краіне ўдалося вярнуць унікальны помнік нацыянальнай культуры — «Малую падарожную кніжку», якая лічыцца першай кнігай, выдадзенай на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

Сярод галоўных падзей 2017-га года — прэзентацыя 20-томнага факсімільнага выдання «Кніжная спадчына Францыска Скарыны», прызёра Гран-пры конкурсу «Мастацтва кнігі», маштабная выстаўка «Францыск Скарына і яго эпоха», міжнародны тэлепраект «Францыск Скарына на мовах народаў свету» і дакументальны фільм «Першадрук», які пакажуць у рамках Дня беларускага пісьменства ў Полацку...



Книга о первом белорусском космонавте

10 июля 2017 года — в день 75-летия со дня рождения нашего именитого земляка вышла в свет книга «Петр Климук. Жыццё і подзвіг касманаўта» на белорусском и русском языках. Обращаясь к читателям, директор издательства Николай Супранович, пишет: «Космонавтика сегодня находится лишь в самом начале своего яркого пути. По меркам истории, если соотнести продолжительность жизни всего человечества и среднюю продолжительность жизни человека, космонавтика проживает всего лишь первые часы, если не минуты своего младенческого периода».



Летчик-космонавт Петр Климук (справа) и писатель-документалист Микола Панасюк во время работы над книгой

Автор этого уникального издания — известный белорусский писатель-документалист, член Союза писателей Беларуси и России Микола Панасюк, один их тех, кто первым в звездную декабрьскую ночь 1973 года приехал в родную деревню космонавта Комаровку Брестского района. Здесь же, в крестьянской избе, он написал интервью с его матерью о важном событии для республиканской газеты «Звязда». Вскоре, познакомившись с Петром Климуком, он жил и работал над рукописью первой книги в Звездном городке, встречался с другими космонавтами. Так в свет вышли его книги «Арыенцір — сузор'е Арыён» (1975) на белорусском языке, «К созвездиям» — на русском (1977). Тогда же отдельной брошюрой в издательстве «Беларусь» вышел очерк «Петр Ильич Климук». Их общий тираж составил 134 000 экземпляров. Тема космоса стала ведущей в творчестве писателя.

Об этом говорит и новая, переработанная и дополненная книга, первые 50 экземпляров которой заказал Брестский облисполком. На торжественной встрече, посвященной 75-летию Почетного гражданина области П. И. Климука, их из рук председателя облисполкома А. С. Лиса в торжественной обстановке и получил наш уважаемый именинник, на счету которого три космических полета.

«Герой нашего издания — первый белорусский летчик-космонавт, дважды Герой Советского Союза Петр Ильич Климук. Эта книга — своеобразный портрет, дополненный фотоматериалом, в создании которого приняли



участие известные государственные деятели Беларуси, ученые, коллеги-космонавты, писатели и журналисты, родная сестра космонавта, друзья детства, земляки», — пишет в своем вступительном слове «Первопроходец на белорусском пути к звёздам», — директор издательства Николай Супранович.

А вот Председатель Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь, доктор экономических наук, профессор, член-корреспондент Национальной академии наук Беларуси Михаил Мясникович замечает: «Петр Ильич Климук — белорусская легенда. Его имя вписано уже в историю Беларуси. Навсегда. Потому что он Первый. Первый белорус в космосе. Петр Климук — золотой фонд нации».

Родным белорусским словом тепло говорят о нем брестские поэты Владимир Ситуха и Надежда Парчук, стихотворение которой «Вітаў з арбіты родный край» она написала по просьбе авторов-составителей незадолго до юбилея космонавта.


Однако главную роль в издании этой уникальной книги сыграл счастливый случай — встреча на Международной книжной выставке 11 февраля 2017 года двух известных людей — писателя-документалиста Миколы Панасюка и директора издательства «Адукацыя і выхаванне» Николая Супрановича. Первый из них ранее общался с космонавтами Алексеем Леоновым, Виталием Севостьяновым, Мирославом Гермашевским и Олегом Новицким, чьи рассказы о космонавте и космосе вошли в первую часть сборника.

Свой вклад внес и писатель, лауреат Государственных премий Беларуси Владимир Липский — беседовал о нашем легендарном земляке с государственными деятелями, учеными, его самыми близкими друзьями.

Светлана ***РУМЯНЦЕВА***
Фото: Денис ***БУСЛЁНОК,***
Алексей ***СКАКУН***








«И тогда спроси свою печаль...»

И тогда спроси свою печаль... : повести, рассказы / Александр Волкович. — Брест : Альтернатива, 2017. — 216 с.





В новую книгу прозы брестского писателя Александра Волковича вошли ранее публиковавшиеся и новые повести, рассказы, эссе и зарисовки, написанные по материалам «вандровок» по регионам белорусского Полесья.


В занимательных историях-элегиях о старине и нови самобытного Полесского края, пересказанных «очарованным странником», наряду с человеческими героями, присутствуют и участвуют кони, птицы, деревья, болота, реки...

Все это — лишь земной, зрительный образ, утверждает автор. — Остальное — в нашей душе, где происходит вечное сражение между светлым и темным, добром и злом, Богом и дьяволом. И дано нам право выбора, на чьей стороне быть. И каждый выбирает. Камертон этого непростого выбора — наша сердечная печаль....

О людском милосердии, о родниковых источниках нашей духовности и нравственности, о месте белорусов на земле рассказывает также эта душевная книга...

В сборнике широко представлены богатый разговорный фольклор полешуков, старинные предания и легенды, непростые людские коллизии и судьбы.

Книга рассчитана на широкий круг читателей всех возрастов.


Волкович Александр Михайлович родился в городе Бресте в 1950 г. в семье военнослужащего. Детство и юность провел в поселке Домачево Брестского района. Закончил Домачевскую среднюю школу.

Трудовую деятельность начал стивидором Архангельского лесоэкспортного порта. Работал на сплаве, лесоповале на Русском Севере и в Сибири.

Закончил факультет журналистики Львовского высшего военно-политического училища. Служил в армейской печати. Работал в районной, областной и республиканской прессе. Открывал и редактировал первую ведомственную газету системы ЛУКОЙЛ «Нефтяник Когалыма» в Тюменской области России.

Член Союза писателей Беларуси, член Белорусского Союза журналистов.

Лауреат международных литературных премий: интернет-журнала «Русский переплет» (2007 г., Москва) в номинации «Большая проза» - первое место, Диплом и Большой приз за повесть «Оберег»; конкурса «Литературная Вена-2008» - первое место в номинации «проза», конкурса военных писателей им. Героя Советского Союза В. Карпова (2009 г., г. Самара) - в номинации «проза». Дипломант областного литературного конкурса им. В. Колесника в номинации «проза» - 2010 г. Награжден Дипломом I степени и бронзовой статуэткой «Золотой Купидон» на Дне Белорусской письменности в Заславье (2014 г.). Дипломат конкурса издательства «Подмосковье» «Наша победа. Наша история. Наша память» в номинации «приз зрительских симпатий» - 2015 г. Лауреат Первой литературной премии Международного фонда «Spiritual Diplomacy» «За высокий профессиональный уровень в произведениях, способствующих этическому росту читателей, и мастерский показ души белорусского народа» (США, 2015 г.).

Автор ряда книг прозы и публицистики.

Живет и работает в Бресте.

ISBN 978-985-521-586-9

ВЕРНІСАЖ




ФОТО с вышиванкой

С 15 июня 2017 года в Брестском районе накануне Дня Независимости Республики Беларусь стартовал фотоконкурс «Сэлфі & фота з вышыванкай». Идею конкурса — сделать традиционное фото или селфи-фото с предметами, в костюмах, содержащих национальный белорусский орнамент — вышиванку, — поддержала работающая и учащаяся молодежь района — активисты Брестского РК ОО «БРСМ». Ребята делали фотографии в самобытных белорусских костюмах, фотографировались в поле, дома, на работе, на фоне традиционных белорусских предметов быта.

Широкую масштабность фотоконкурс приобрел в сети Интернет. Участники конкурса активно выкладывали в социальные сети свои фото, сделанные в костюмах с вышиванкой, популяризируя национальную культуру и традиции белорусского народа.

Лилия ПУЛЯШКО,
первый секретарь РК ОО «БРСМ»



Маргарита Пищик, СШ д. Скоки
Нарина Дренюк, СШ д. Вистычи

Никита Балабушко, Анна Тит, Александр Очеповский, Александра Дементей, д. Б. Радваничи



Денис Горун, Павел Алянгин,
д. Вельямовичи



Семья Алянгиных: Виталий Витальевич (папа), Антонина Михайловна (мама), Павел и Маргарита (дети), д. Вельямовичи



Александр Панасик, д. Малые Радваничи



Марина Теребей, Лилия Пуляшко, Ирина Леонова,
Брестский РК ОО «БРСМ», Брестний РИК



Назик Егиазарян,
д. Б. Радваничи



Елизавета Пуляшко, СШ д. Скоки



Варвара Чинцова,
д. Вистычи

В Малорите появился собственный арт-объект — птица-символ 2017 года хохлатый жаворонок

Считается, что большинство арт-объектов появляется в крупных городах. Но в Малорите также решили разнообразить боковую стену старой гостиницы. Там нарисовали птицу-символ 2017 года — хохлатого жаворонка.

Акцию с граффити инициировали ОО «Ахова птушак Бацькаўшчыны» и орнитолог Денис Китель. Рисунок появился благодаря сбору средств на краудфандинговой платформе «Талака»: общими усилиями нужная сумма была собрана. К слову, местные власти решили не прощаться в декабре с птицей года, а намерены утвердить хохлатого жаворонка птицей-символом Малоритского района. Предполагается, что граффити будет помогать продвигать крылатую «визитную карточку» Малориты.

Автор Сергей МОЩИК



Автор макета и художник — Алесь Благий (Kontra).

СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ



Ціна ХУТАРАНКА

Аргенцінскае танга Сымона ПЯЧКО з вёскі Чэрні

По старонках сямейнага фотаальбома

Шмат гадоў архіў маяго дзядзькі Сымона знаходзіўся ў асобным канверце і чакаў свайго часу паміж агульных фотаздымкаў у бацькоўскім фотаальбоме.

У мінулым годзе ў мяне з'явілася нагода, я адшукала яго і размясціла ўсе фатакарткі ў маленькі фотаальбом, які мне падаравала аднойчы мая старэнькая настаўніца — Коваль Кацярына Сямёнаўна.

Каб павесці аповед пра жыццё дзядзькі Сымона ў Аргенціне, напэўна трэба ўявіць тыя абставіны, якія вымусілі дваццацігадовага хлопца ехаць за акіян.

У 14-м годзе ўвесь заходні народ быў выгнаны царызмам у бежанцы па Расіі. Ехалі туды на кароткі тэрмін, а вярнуліся толькі ў 22-м годзе. Роднае сяло Клімавічы было спалена дашчэнту.

З Расіі многія клімаўцы прыйшлі пехатою, а некаторыя прыехалі вазамі, да пустога месца. Усе палеткамі, пазарасталі маладым бярэзнікам і вальхоўнікам, у якім выводзіліся лісы ды зайцы. Людзі пачыналі жыццё з зямлянак, голаду і холаду. Дзеці рвалі на суп крапіву, лебяду і шчаўе. У народа, які вярнуўся дадому, не было ніякіх гаспадарак і харчавання.

Браты Печкі прыехалі з Расіі на конных падводах. Клім прывёз сваю сям'ю раней, а Тамаш застаўся чакаць разліку за працу збожжам. Жылі ж ў бежанцах на Тамбоўшчыне, і ўсе гады працавалі, не разгінаючы спіны, на тых, хто прытуліў.

Дадому вырашылі ехаць пасля жніва. У час гарачай пары ўсе жалі ж сем'ямі гаспадарскую ніву. Вядома, за працу хацелася атрымаць зерне, з якога трэба было пачынаць жыццё на бацькаўшчыне. Таму вось Тамаш і застаўся з Клімавай жонкай, Фядосяй, чакаць разліку. Тая ў час працы на полі папала пад дождж, прастудзілася і праз тыдзень памерла.

Раптова асірацелі дзеці, і Клім стаў удаўцом, таму яму прыйшлося ажаніцца ў другі раз і прывесці дзецям мачаху.

У бацькі Сымона, Пячко Кліма Яўхімавіча, была вялікая сямья. Меў ён добры надзел якаснай зямлі, але сыноў у яго было чацвёра. Таму ён разважаў так:


— Падзялі зямлю паміж усімі — і ўсе стануць жабракамі. Зямля будзе самаму меншаму — Алёшы, а астатнія будуць жыць з-за рамясла.

І Клім усім тром стараўся даць прафесію. Сямёна ён аддаў на навуку да каваля. Вывучыўся хлопец і доўгі час працаваў у падмайстрах. У прызыўны ўзрост палякі не ўзялі яго ў армію. Прызналі ў юнаку якуюсьці нягоднасць для вайсковай службы. А калі так, то трэба было станавіцца самому на ногі і зарабляць самастойна свой кусок хлеба. Хлопец жыў мараю аб сваёй асабістай кузні.

Для гэтага патрэбны былі немалыя грошы... А дзе іх узяць? Прасіць у бацькі ён не адважваўся, бо той усё біўся над пабудовай новай хаты і развіццём гаспадаркі.

З архіва Сымона ПЯЧКО



























— Хіба схадзіць да дзядзькі Тамаша за парадай? — разважаў сам з сабою Сымон. — Дзядзька ж, адважны чалавек! Ён не пабаяўся, кінуў сям'ю, і паехаў на заробкі ў Амерыку. Прабыў там тры гады і вярнуўся з грашыма. А зараз марыць вылезці з зямлянкі, пабудавацца і разжыцца.

Аднойчы ў нядзелю Сымон і зайшоў да Тамаша, які жыў у суседстве, пагаманіць:

— Дзень добры ў хату! — прывітаўся хлапец. — Пачуў, што вы вярнуліся з вандроўкі, і вось зайшоў, каб пагутарыць з вамі...

— Ну, заходзь, заходзь, пляменнік! — адказаў дзядзька і рушыў насустрач з працягнутымі для абдымкаў рукамі. Чалавек, ён быў высокі, шыракаплечыі з прыгожым тварам. З-пад калматых броваў выглядалі вялікія, блакітныя вочы, а ў пышных вусах іграла прыветлівая ўсмешка.

Дзядзька абняў пляменніка і запрасіў сесці ля стала.

— Ну, расказвай, як твае справы?

— Справы — справамі, а я вось, задумаў кузню пабудаваць, ды замінка за грашыма. Прыйшоў да вас за парадай... — пачаў нясмела размову Сымон.

— А што я магу парадзіць? Ты ж малады, вольны і смелы хлапец. У горадзе існуе жыдоўская суполка, якая вярбуе нашых людзей на працу ў Амерыку. Ідзі туды, запісвайся і не прагадаеш. Пабачыш свету, заробіш грошы, а вярнуўшыся, пабудуеш кузню. Гэта ўсё, што я магу табе парадзіць... — такі адказ даў дзядзька пляменніку.

— Я ж вось, не спужаўся і з'ездзіў на тры гады. Цяжка мне там было. Бурлаком у Парагваі працаваў... Але ж зарабіў грошы... Цяпер пачну будоўлю хаты і стану падымаць гаспадарку.

Сымон даўно ведаў пра вярбоўку, але яму не хапала рашучасці. А пагаварыўшы з дзядзькам, як бы знайшоў яе. Прыйшоў дадому і абвясціў аб гэтым бацьку. Клім выслухаў сына і падтрымаў:

— Едзь, сынок! Можа і табе пашанцуе. Каня прадам, і будуць грошы на білет да Амерыкі.

У горадзе Сымон схадзіў у суполку і запісаўся ў спіс жадаючых выехаць за акіян. Праз некаторы час, на караблі з Гданьска, ён у гурце такіх жа, як і сам, беспрацоўных, адплыў у «Новы Свет».

Параход з польскімі перасяленцамі прыбыў да берагоў Амерыкі ў Аргенціну. Там вярбоўшчыкі іх прадалі, бы рабоў для землеўласнікаў. Дзесяць гадоў Сымон прапрацаваў кавалём і чорнарабочым на фазэндзе дзесьці пад Буэнас-Айрэсам. Аб гэтым сведчыць фатакартка, на якой ён стаіць пад пальмай у рабочай вопратцы.

Атрымліваў ён за сваю працу ў тры разы менш рабочых з мясцовага насельніцва. І толькі пражыўшы там дзесяць гадоў, і вывучыўшы іспанскую мову, Сымон атрымаў Аргенцінскае грамадзянства. Такім чынам, ён меў ўжо правы на самастойны пераезд і стаў раўнапраўным грамадзянінам Аргенціны.

Хлопец акрыляў і вырашыў перабрацца з фазэнды ў горад.

Неўзабаве ён разлічыўся з гаспадаром і пераехаў у Буэнас-Айрэс.

У сталіцы малады чалавек знайшоў працу на швейнай фабрыцы. Прайшоў курс навучэння і стаў працаваць там на канвееры закройшчыкам.

Праца на фабрыцы пачыналася па гудку, і перапынкі адбываліся таксама па гудку. У час іх кожны рабочы што хацеў тое і рабіў:

— Я мог курыць, ляжаць на лаўцы, піць «мату» — так называўся там чай. А калі гудзеў гудок, то з той жа хвіліны я павінен быў ужо працаваць...

У вольны ад працы дзень, рабочыя адпачывалі. Прыгожа апранутыя яны

арганізоўвалі цікавыя пікнікі і вечарынкі, на якіх заўжды было што выпіць, але харчаванне было сціплым. Многа есці там лічылася непрыстойным.

Пілі ром шкляначкамі — напарсткамі, у якіх змяшчаўся адзін глыток напою.

— Такой чарачкай я мог выпіваць з кожным і ўвесь вечар. Пасля глытка рому я толькі закурваў сігару, але ніколі не быў п'яны.

Такую шкляначку дзядзька Сымон прывёз з сабою з Аргенціны, і першапачаткова карыстаўся ў бяседах толькі ёю...

У Буэнас-Айрэсе Сымон быў закаханы ў прыгожую аргенцінку, з якой працаваў на фабрыцы. Як мог, так ён удзяляў ёй сваю ўвагу, але так і не адважыўся зрабіць прапанову на шлюб.

— Мая каханая зарабляла больш чым я! Я бы быў побач з ёю — ніхто! А там не лічыўся за гонар няроўны шлюб... Таму я застаўся назаўсёды адзін.

З газет і з радыё мы ў Аргенціне ведалі пра вайну з гітлераўскай Германіяй і пра перамогу Расіі.

Вядома, там мне кожную ноч снілася Радзіма. Жыццё ж там, у параўнанні з Польшчай, у сотні разоў багацейшае і лягчэйшае. Але ж на чужыне мы ўсе былі людзьмі другой якасці.

Па радыё перадавалі пра савецкую Расію так прыгожа, што ўсім нам здавалася, што там сапраўдны рай.

— Мы тут мыкаемся, а дома ж заўжды лепей!

Гэта было ўжо пасля смерці Сталіна.

Амаль праз трыццаць гадоў з дня ад'езду, як толькі былыя польскія аргенцінцы атрымалі дазвол на вяртанне на Радзіму, усе дружна сабраліся і паплылі дадому на караблі.

У Адэссу тады прыбыў іх цэлы параход — 500 чалавек!

На частцы фотаздымкаў выразна бачна падрыхтоўка да гэтага мерапрыемства. На адным стаіць дзядзька Сымон з сябрам на фоне партовага пад'ёмнага крана.

Дзядзьку Сымона прывезлі эмгэбісты з поезда ў Клімавічы на «Волзе», як паважанага і пачэснага грамадзяніна — іншаземца. Потым быў дастаўлены яго багаж, у які ўваходзілі некалькі вялікіх куфраў і чамаданаў.

Грошы з Аргенціны ўвозіць не дазвалялася, таму ўсё тое, што ён зарабіў за акіянам, прыйшлося перавесці ў вопратку, касцюмы, паліто, скураныя курткі, коўдры і другія асабістыя рэчы.

Усіх тых рэпатрыянтаў тут у нас сталі называць «амерыканцамі». Да дзядзькі Сымона назаўжды тады прыліпла гэтая мянушка.

У СССР вялася мэтанакіраваная прапаганда вольнага і шчаслівага жыцця. Калі аргенцінскія рэпатрыянты атрымалі дазвол на зварот не ў Польшчу, а цяпер ужо ў Савецкі Саюз, то ў Брэсце ім былі дадзены кватэры ў новых, толькі пабудаваных дамах, што па вуліцы Маскоўскай. Цяпер яна называецца «праспект Машэрава».

Там, у доме з кнігарняй «Навука» (цяпер — «Асвета») жыў у 60-я гады аргенцінскі сябар Сымона — Іван. Нажаль я не ведаю яго прозвішча. Пасля звароту на Радзіму, ён ажаніўся тут і атрымаў кватэру. У яго сям'і нарадзіліся дзеці — хлопчык і дзяўчынка. Бацькам Хросным для іх быў запрошаны Сымон.

У падлеткавым дзяцінстве я часам бывала ў гасцях у свайго роднага дзядзькі. Яму, як халастому мужчыне, дзяржавай было дадзена месца для жылля ў пакоі інтэрната, што на Куйбышава, 9. Праз гады, ён там атрымаў маленькі асобны пакойчык.

У Брэсце ён працаваў на швейнай фабрыцы імя Фаміна закройшчыкам. У калектыве яго паважалі, аб чым сведчыць яго фотакартка, дзе ён стаіць з падарункам у руках.

Аднойчы дзядзька Сымон узяў быў мяне з сабою ў праведкі да Івана. У той час аўтобусы па горадзе рухаліся вельмі рэдка, таму мы ішлі з Куйбышава на Маскоўскую пехатою. Іван быў безнадзейна хворы на рак. А праз нейкі час і памёр.

У фотаархіву ёсць фатакарткі з яго пахавання. Сфатаграфавана машына з труной нябожчыка ў час рухання па Маскоўскай ў накірунку да Трышынскіх могілак. Абапал вуліцы на фотаздымку стаяць дамы таго часу.

Рэпатрыянты трымалі паміж сабою моцную сувязь. Іхняя суполка часта збіралася летам на возеры «Селяхі». Усе там, у сваім цесным коле, успаміналі пра Аргенціну, як пра казачны рай, у якім ім прыйшлося нядаўна жыць.

Жыццё на Радзіме было непараўнальна бедным і цяжкім.

Нядаўна ж толькі прайшла разбуральная вайна. «Амерыканцы» гэта разумелі, але «рыба жыве там, дзе глыбей, а чалавек — дзе лепей».

У дзесяцігадовы тэрмін, адзін за другім, яны выехалі ўсе назад за акіян на пастаяннае месца жыхарства.

З тых 500-т чалавек, што прыплылі на караблі ў Адэссу засталіся тут толькі Іван, які памёр ад раку, і Сымон.

Некалькі разоў Сымон пісаў пісьмы ў Маскву, у якіх прасіў дазволу ў савецкай улады на выезд у Аргенціну, але кожны раз яму было адмоўлена. Аднойчы ён, нават, сам паехаў на гутарку ў Крэмль, а потым ў Аргенцінскае пасольства. Але яму зноўку было адмоўлена:

— У вас жа няма ў Аргенціне ніякіх сваяцкіх сувязяў!

— Але ж мае сябры ўсе выехалі! — паспрабаваў пярэчыць у адказ Сымон.

— Яны вярнуліся назад па выкліку родзічаў.

Гэта быў важкі і не абвяргальны факт. Упершыню ў той момант Сымон пашкадаваў аб тым, што не ажаніўся ў Аргенціне.

Прыехаў ў Брэст у падаўленым настроі. Мара на вяртанне памерла канчаткова. Дзядзька засумаваў і часам у размове з братам, Фёдарам, прызнаваўся:

— Зараз, каб дазволілі, я бы пехатою пайшоў назад...

Недазвол моцна падкасіў яго жыццёвыя сілы, і з ім упершыню здарыўся інфаркт.

Доўга ляжаў «амерыканец» у бальніцы, але калі суджана было яшчэ жыць, то выжыў і пражыў да 1969 года. А ў тым ракавым годзе з ім здарыўся другі раз інфаркт, і Сымон зімою памёр. Пахаваны Пячко Сымон Кліменцьевіч у Чэрнях на вясковых могілках побач са сваім бацькам і меншым братам Фёдарам.

Дзядзьку Сымона я памятаю чалавекам высокай культуры і інтэлегентнасці. Ён ніколі і ні разу, ні ў размовах і ні ў спрэчках не павысіў голас, і не перайшоў на крык. Ніколі не прамовіў непрыстойнае слова! Заўжды быў жыццярадасны і ветлівы.

Да інфаркту ён шмат курыў, але ні разу не закурыў у хаце. Курыў так, што ўставаў ноччу. І зноў! Нават зімой апранаў паліто і выходзіў курыць у двор.

Доўгі час на гарышчы ў нашай хаце знаходзіўся яго скураны чамадан і аргенцінскія куфры. Нядаўна я палезла на гарышча, каб знайсці той чамадан... Абхадзіла ўсе закуточкі. Куфры паношаныя і запыленыя яшчэ там стаяць, а чамадана нідзе няма.

— А да чаго гэта я?

— Многа гадоў таму назад па тэлевізару ішло шматсерыйнае кіно пра італьянца, заехаўшага ў Аргенціну. Дык кожная серыя яго пачыналася са здымкаў такога ж чамадана. Усякі раз я тады ўспамінала роднага дзядзьку Сымона.

Память о старинном поселении германцев и голландцев в пойме Западного Буга хранят в Домачево

В этом году исполнилось 400 лет с момента основания колоний Нейдорф и Нейбров, до первой половины XX века располагавшихся по соседству с г. п. Домачево. В честь круглой даты 4 июня городской поселок и его окрестности посетили потомки тех самых «голендров» — из Германии, Украины и далекого Забайкалья.



Протестанты — выходцы из Германии и Голландии — основали свои поселения в пойме Западного Буга в 1617

Мост через р. Западный Буг в районе Домачево-Словатычи. Снимок 1932 г.





Орудия труда, найденные при раскопках в колонии Нейбров

году. Со временем эти колонии превратились в процветающие хозяйства, и для ведения торговли они стали привлекать местных жителей, которых называли «дольмечер», что на немецком означает «переводчик». По одной из версий, это слово, искаженное на местный манер, и послужило названием для близлежащего населенного пункта, а ныне городского поселка Домачево.

Немецкие колонии просуществовали до 1939 года — до воссоединения Западной Белоруссии и БССР. Так и не приняв советский режим, одни «голендры» вернулись на историческую родину, другие переехали в Польшу. Сегодня о поселениях напоминают лишь сохранившиеся надгробия старого кладбища в лесном массиве. Эту местность во время своего визита и посетили представи-

Сохранившиеся надгробия немецкого лютеранского кладбища колонии Нейдорф





тели делегации, где открыли памятный знак, посвященный 400-летию основания колоний.

С хлебом-солью, народными песнями встречали зарубежных гостей в г. п. Домачево. На прибужской земле их приветствовали администрация Домачевского сельисполкома во главе с председателем Владимиром Хватиком, работники местного Дома культуры и коллектив «Вечарына» Домачевского ПДК. Во время экскурсии потомки «голендров» познакомились с достопримечательностями городского поселка и посетили Свято-Лукинскую церковь. Настоятель Димитрий Каратай рассказал им об истории храма и даже предоставил возможность позвонить в старый колокол, который когда-то украшал протестантский собор, действовавший в немецких поселениях. Оценили по достоинству гости и белорусскую кухню в домачевском кафе «Сосны». Завершением программы стала увлекательная поездка в информационно-экологический центр ГПУ «РЗ «Прибужское Полесье».

Александра ПЕТРОВА
Историческая справка:
www.domachevo.com







Торжественное открытие памятного знака в честь 400-летия «голландских» поселений в районе п. Домачево



КАЛАЎРОТ КУЛЬТУРНАГА ЖЫЦЦЯ



Празднование 73-й годовщины освобождения Брестского района

В Скоках прошли торжественные мероприятия, посвященные 73-й годовщине со дня освобождения Прибужья от немецко-фашистских захватчиков. Митинг, посвященный славной дате, открыл председатель райисполкома Владимир Сенчук.

— Мы склоняем головы у памятника землякам, которых не стало за годы Великой Отечественной войны,















перед гранитным воином, стерегущим над братской могилой вечный покой советских воинов, погибших при освобождении района от немецко-фашистских захватчиков, подчеркнул он. — Мы верим, что и наша молодежь, воспитанная на традициях старших поколений, сохранит историческую память, стабильность и спокойствие на родной белорусской земле.

Сегодня осталось так мало людей, кому лично можем сказать спасибо за этот подвиг. От кого мы можем услышать, как все было на самом деле. И один из них — ветеран Великой Отечественной войны Эдуард Зимовец. Заключительные слова проникновенного и волнующего выступления Эдуарда Михайловича потонули в долгих аплодисментах.

Депутат Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь, заместитель председателя Постоянной комиссии по национальной безопасности Владимир Базанов еще раз обратил внимание на цену завоеванной мирной жизни, пожелал ветеранам выполнить наказ Президента жить долго.

Многочисленных зрителей ожидала военно-историческая реконструкция «Возвращение», посвященная осво-



бождению города над Бугом и района от немецко-фашистских захватчиков. Зрелище действительно получилось ярким и документально-правдивым.

Исключительной особенностью субботнего дня явилась народно-патриотическая акция Федерации профсоюзов Беларуси «Мы — вместе!». В ее рамках выступили финалисты республиканского конкурса «Новые имена Беларуси». Порадовали зрителей своим мастерством и звезды белорусской эстрады: Эдуард Ханок, Алексей Хлыстов, Ольга Плотникова, группа «БАЙСИТИ».

Председатель областного объединения профсоюзов Александр Мурашкин вручил награды Федерации профсоюзов Беларуси — медали «110 год прафсаюзнаму руху» и Благодарности Федерации активистам профсоюзного движения, а председатель районного объединения профсоюзов Валентина Тимошук чествовала трудовые династии нашего района.

Награждение «Молодых специалистов и наставников» осуществили начальник отдела образования спорта и туризма райисполкома Виталий Черепенько и председатель районного комитета профсоюза работников агропромышленного комплекса Елена Просмыцкая.





Летняя сцена в парке не пустовала до позднего вечера. Свое мастерство демонстрировали как взрослые творческие коллективы учреждений





культуры Прибужья, так и юные дарования. Работали фотовыставка районной библиотеки «Дорогами освобождения», выставка-продажа мастеров народного творчества. Прошли показательные выступления сотрудников РО ЧС и игры чемпионата района по футболу.

Заключительным аккордом мероприятий в Скоках стала праздничная дискотека в местном СДК.

Григорий ЯРОМЧИК
Фото Сергея ХМЕЛЯ,
Михаила ГУБАРЕВА,
Александра ВОЛКОВИЧА





А гармонік заліваецца, і музыка так стараецца...



У сярэдзіне мая ў Тэльмы з'ехаліся таленавітыя людзі на музычнае свята «Берасцейскі гармонік» з розных куточкаў нашай вобласці, а таксама з Расіі.

Распачаў святочную праграму народны ансамбль песні «Спадчына», мастацкім кіраўніком якого з'яўляецца Уладзімір Літвінчук. Пасля іх на сцэну выйшаў ансамбль народных інструментаў «Сябрына» пад кіраўніцтвам Віктара Дзямянюка.

Захапленне гледачоў выклікала выступленне Валерыя Болатава, які прыехаў з Расіі, з горада Істра. Дарэчы, ён з'яўляецца кіраўніком клуба гарманістаў «Муравушка», удзельнікам праграмы «Іграй, гармонь», а таксама арганізатарам фестываляў гармоніка. А яшчэ гэты таленавіты чалавек папулярызуе гармонь на сваім канале ў «Ютубе», дзе знаёміць шматлікіх гледачоў з творчасцю здольных людзей.

Між іншым, на Брэстчыне ёсць і таленавітыя жанчыны, якія віртуозна валодаюць гармонікам. Напрыклад, Вольга Драпун з дзяцінства іграе на музычным інструменце і ўдзельнічае ў народным ансамблі «Сузор'е». Працуе будаўніком-тэхнолагам. Яна на мерапрыемстве ўзняла настрой публіцы, выканаўшы прыпеўкі.



Зала таксама атрымала асалоду ад выступу з жартаўлівымі прыпеўкамі гурта «Лучына» з вёскі Скокі.

Не пакінула абыякавым нікога з прысутных майстэрскае валоданне інструментам Івана Ляўчука з вёскі Балата, што ў Кобрынскім раёне.

Яшчэ адзін творчы чалавек — Станіслаў Салаўёў — усё паспявае: і працаваць на вытворчасці, і вершы пісаць, і песні, і ў фестывалях гарманістаў у Гомелі, Мінску, ды ў Маскве паўдзельнічаць. Вялікі аматар гармоніка, менавіта ён — ініцыятар і галоўны арганізатар цудоўнага мерапрыемства.

Выступленне Аляксея Мядзведзева, які прыехаў з горада Мурама і з'яўляецца гарманістам залатой дзясяткі Расіі, стала яркім фіналам свята.

— З упэўненасцю магу сказаць, што музыка ў маім жыцці мае вялікае значэнне, — паведаміў карэспандэнту гарманіст. — Хацеў бы пажадаць усім прысутным не абыякавым да гармоніка людзям, каб яны працягвалі і далей любіць гэтую справу, таму што народны музычны інструмент



аб’ядноўвае людзей, лечыць іх душы, дазваляе жыць з добрым настроем.

Свае словы падзякі ўдзельнікам свята выказалі намеснік начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Брэсцкага райвыканкама Эла Марозава і старшыня Брэсцкага райкама прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму Галіна Крысанава. Яны адзначылі, што, безумоўна, усім прысутным на мерапрыемстве артысты змаглі падарыць незабыўныя ўражанні. Сведчаннем гэтаму сталі шчырыя і адкрытыя ўсмешкі, кожная выкананая кампазіцыя завяршалася гучнымі апладысментамі. Усе ўдзельнікі музычнага свята атрымалі дыпломы і сувеніры.

Святлана САЎЧУК
Фота аўтара







Виртуозы цимбал

10-летний юбилей в июне текущего года отметил инструментальный ансамбль «Астрамечаўскія жаўрукі» Остромечевской детской школы искусств. Поздравить ребят и поддержать аплодисментами пришли родители, учителя и гости.



Юные артисты представили свои лучшие номера — сольную и ансамблевую игру на музыкальных инструментах, вокальное пение, яркие танцевальные постановки. Директор школы искусств Татьяна Прокопович отметила, что, несмотря на меняющиеся времена и вкусы, школа остается храмом искусства, где начинают свой непростой путь юные музыканты. Были награды, цветы, подарки. От коллектива ОАО «Остромечево» директор хозяйства Олег Бурак вручил ребятам юбилейный торт.

Неизменного руководителя ансамбля учителя по классу цимбал Аллу Ильюк, концертмейстеров Веру Собирову, Оксану Антонюк и их воспитанников объединяет любовь к народ-

ной музыке и цимбалам — символу белорусской музыкальной культуры. Прошло более восьми веков, как цимбалы стали известны на территории белорусских земель, но и сегодня они не утратили своей музыкальной привлекательности. Этот инструмент, как и василёк, олицетворяет нашу страну с богатой историей и культурой. Алла Николаевна смогла собрать цимбальный ансамбль в составе мальчишек. Есть в коллективе и девочки, но им поручают больше петь, чем играть.

Деятельность коллектива не ограничивается концертными мероприятиями. Ансамбль выступает на конкурсах, смотрах, фестивалях различных уровней. «Астрамечаўскія жаўрукі» получили Диплом лауреата на III открытом республиканском форуме цимбалистов «Сярэбраны звон цымбалаў» в Барановичах, стали дипломантом II степени межрегионального праздника-конкурса инструментальной музыки «Музыкальный калейдоскоп» в Дрогичине. Особым событием для коллектива было участие в фестивалях в Польше и специальной программе телевидения с музыкально-хореографическим представлением «Гуканне вясны». Коллектив также участвовал в празднике «Я играю на цимбалах» в Брестском музыкальном колледже им. Г. Ширмы и завоевал диплом победителя.

Уходят из ансамбля выпускники детской школы искусств, ученики по классу цимбал Александр Сериков, Андрей Пашкевич, Дмитрий Кулага, ученики отделения хореографии Илья Литвинов и Михаил Кориневич. Им на смену уже пришли новые участники. На концерте выступил младший состав «Астрамечаўскіх жаўрукоў» — такие же талантливые, эмоциональные, дружные и влюбленные в белорусскую народную цимбальную музыку. Концерт прошел на одном дыхании. Виртуозная и воодушевленная игра ребят впечатляла от первой до последней ноты. Мы надеемся, что удивительный и увлекательный мир музыки и творчества будет волновать их и в дальнейшем, ведь музыка облагораживает человека, делает его добрее и милосерднее.

Галина МАКОВЕЦКАЯ, методист районного методического центра.
Фото Михаила ГУБАРЕВА



Культурны дэсант у Славакію

Калі людзі жывуць дружна і праца ладзіца, і любыя няўзгоды пераносяцца лягчэй, і песня льецца весялей. Для сапраўднай дружбы не стануць перашкодай ні граніцы, ні кіламетры, ні языкавы бар'ер. Зусім нядаўна, 16–19 чэрвеня, вялікая дэлегацыя, ў склад якой увайшлі вучні сярэдняй школы в. Вістычы, кіраунікі Брэсцкага райвыканкама, Лышчыцкага, Чарнаўчыцкага, Тамашоўскага сельскіх Саветаў, народны ансамбль «Благавест», народны ансамбль музыкі і песні «Астрамечаўскія Лявоны» пабывалі ў Славакіі.





Заключэнне дагавораў паміж рэгіёнамі на сумесную працу

Як аказалася, наладзіць дабрасуседства і дружбу праз простыя чалавечыя адносіны — найлягчэйшы шлях. Каб гэта зразумець, трэба было бачыць, як сустрэліся беларускія і славацкія дзеці! Яны пасябравалі, калі славацкія дзеці гасцявалі на Брэстчыне. Колькі было радасці, абдымкаў! Дзеці шчаслівыя хуценька раз'ехаліся па семьях. А дарослых чакалі сур'езныя справы — заключэнне дагавораў паміж нашымі рэгіёнамі на сумесную працу. Пазней такія дагаворы падпісалі старшыня Лышчыцкага сельсавета Іна Дзячак і Тамашоўскага — Алёна Бурак, ад Славакіі — мэр горада Соль Ёзэф Бэрта і стараста сяла Мала Дамаша Яраслаў Макатура.

Удзельнікаў народных калектываў таксама чакала вялікая праграма. У гэтыя дні ў Славакіі адзначалася свята Святога Януса, а ў мястэчках Соль і Замутаў — яшчэ і святы вёсак. У час паездкі ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці мелі унікальную магчымасць пазнаёміцца з культурай краіны, пабачыць выступленні сваіх замежных калег, зразумець — колькі ўсяго цікавага можна для свайго калектыву пераняць! Пабачылі, у якой пашане ў славакаў скрыпка — выступалі ансамблі скрыпачоў, індывідуальныя выканаўцы. Усім вельмі спадабаліся мясцовыя танцы — гэта і тэмперамент, і задор, і гумар. Тут толькі запамінай, як кажуць, «матай на вус».







Але мы не толькі прыехалі паглядзець на другіх, але і сябе паказаць. Нашы канцэртныя праграмы ішлі адна за другой — то пачынаў канцэрт народны ансамбль музыкі і песні «Астрамечаўскія Лявоны», то народны калектыў «Благавест». Мясцовыя жыхары, людзі старэйшага пакалення, добра гавораць на рускай мове, разумеюць і беларускую, таму выступленні калектываў прымаліся вельмі сардэчна, працяглымі апладысментамі.

За 12-ці часовы пераезд калектывы вывучылі некалькі песен і на заканчэнні канцэртаў спявалі іх разам. Гледачы прымалі выканаўцаў вельмі горача, але калі гучала «Катюша» — абыякавых людзей проста не было. Усе спявалі разам з намі стоячы, быццам гэта гімн. Яно і так, бо за савецкі час у Славакіі добра ведалі гэтую песню.

Пасля выступлення народных калектываў «Астрамечаўскія Лявоны» і «Благавест» падыходзілі да нас людзі, дзякавалі за прыемныя хвіліны адпачынку, а потым проста гаварылі, гаварылі... Расказвалі хто адкуль родам, якая сям'я, пра дзяцей і ўнукау, а пасля, як працяг канцэртаў, разам спявалі і танчылі, танчылі і спявалі... Нягледзячы на позні час разыходзіцца нікому не хацелася.

Дадому ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці прывезлі часцінку славацкай культуры, непаўторныя ўспаміны, новыя песні. Калектывы таксама папоўнілі спіс новых сяброў. А яшчэ прывезлі надзею, што скора спаткаемся, бо на свята «Дажынкі-2017» у Брэсцкі раён павінны прыехаць калектывы з Славакіі — таксама своеасаблівы культурны дэсант.

P.S. Калі давядзецца пабываць нам яшчэ раз у Славакіі, то абавязкова выканаем славацкія народныя песні і танцы.

Людміла МЕЛЬНІК,
фота аўтара

Здымак на памяць са славацкімі сябрамі



ЗВЕЗДА

XX ТЕЛЕВИЗИОННЫЙ ФЕСТИВАЛЬ АРМЕЙСКОЙ ПЕСНИ

Состоялся финал одного из самых масштабных проектов Министерства обороны Республики Беларусь — телевизионного фестиваля армейской песни «Звезда». В 20-й раз продемонстрировать мастерство в исполнении военно-патриотической песни в Минске собрались участники со всей страны.

Финал фестиваля проходил на сцене Центрального Дома офицеров города Минска. Многие участники приехали в столицу задолго до начала концерта, волновались и переживали. Речь не только о дебютантах проекта, но и бывалых вокалистах. Отчасти финалистов фестиваля можно понять, в жюри — профессионалы. Фестиваль армейской песни «Звезда» любим не только людьми в погонах. Ярким подтверждением этих слов являются финалисты. О чувствах, дружбе, войне, Победе, боли, радостях пели от млада до велика.







Ольга Варганова — лауреат первой премии в номинации «Исполнители армейской песни»

Исполнительское мастерство финалисты продемонстрировали в четырех номинациях: «Исполнители армейской песни», «Авторы-исполнители», «Вокальные группы и ансамбли», «Исполнители военно-патриотической песни».

В номинации «Исполнители армейской песни» лауреатом первой премии стала Ольга Варганова, представитель 115-го зенитного ракетного полка Военно-воздушных сил и войск противовоздушной обороны, хормейстер районного Дома культуры д. Черни. Ольга исполняла песню «Непрошенная война», которая покорила сердца жюри и зрителей.

Дмитрий ПЕРКОВЕЦ

«Водарам яблычны спас наталіў»

Во второй раз отгремел праздничными мелодиями под щедрый ливень долгожданного дождя районный фестиваль «Вістыцкі яблык».



К тому же православные верующие накануне праздновали Преображение Господне, или Яблочный Спас.

Настоятель Свято-Крестовоздвиженской церкви отец Анатолий на въезде в агрогородок, у поклонного креста, провел обряд освящения яблок, с которыми пришли и приехали на мероприятие местные жители, брестчане и высокие гости. В том числе помощник Президента Республики Беларусь — главный инспектор по Брестской области Василий Герасимов, депутат Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь Владимир Базанов, первый







заместитель председателя комитета по сельскому хозяйству и продовольствию облисполкома Сергей Буткевич, глава райисполкома Владимир Сенчук, председатель районного Совета депутатов Людмила Жукович.



Владимир Сенчук искренне и от души поблагодарил сельчан за добросовестный и производительный труд. И вместе с директором «Агросад Рассвет» Василием Желенговским под бурные аплодисменты открыли самый приятный, самый ароматный и неожиданный сюрприз для всех присутствующих на фестивале — десятиметровый пирог.

Ведущие озвучили итоги конкурса подворий сельских Советов, а глава района под аплодисменты собравшихся вручил Дипломы победителей председателям Клейниковского, Лыщицкого и Чернавчицкого сельисполкомов. Отдельной награды были удостоены и сами «рассветовцы».





















Хозяевам агроусадеб, которые поднялись в своей номинации конкурса на пьедестал почета, дипломы и подарки вручил заместитель председателя райисполкома Павел Волынец.

В этом году замечательную дату отмечает ОАО «Агро-сад Рассвет». 40 лет назад, осенью 1977 года, на территории совхоза «Рассвет» был заложен сад «Дружба» площадью 122 гектара.

Об истории его развития, людях, которые стояли у истоков, достижениях и успехах нынешнего поколения садоводов говорил со сцены руководитель хозяйства Василий Желенговский. Лучших работников предприятия он наградил грамотами и ценными подарками. А председатель районного Совета депутатов Людмила Жукович вручила Почетную грамоту райсовета агроному предприятия Ирине Солодуха. Грамоты райкома профсоюза работников АПК передовики предприятия получили из рук председателя первичной профсоюзной организации хозяйства Ларисы Козловской.



С 40-летним юбилеем местных тружеников сада поздравили гость из Польши Генрих Озонек, старейший садовод Республики Беларусь Михаил Сухоцкий, ветеран труда Ольга Дробышева.

В рамках фестиваля прошел открытый конкурс исполнителей белорусской народной песни под названием «Нашага краю любімыя спевы». В рамках этого конкурса свое мастерство продемонстрировали песенные коллективы и сольные исполнители из Прибужья, Пружанского, Жабинковского, Барановичского и Малоритского районов.

Тепло приветствовали в Вистычах и гостей из Словацкой Республики — замечательный коллектив «Замутовчане».

В течение всего дня на территории перед местным Домом культуры были развернуты многочисленные выставки-продажи изделий ремесленников и продукции предприятий района. Функционировала площадка «Здоровье».

Многолюдно было у информационно-познавательной выставки районной централизованной библиотечной системы. Не пустовали детская игровая площадка и площадка рыцарского клуба «Западная уния». Периодически жаркие баталии разворачивались на спортивной площадке.


Достойным заключительным аккордом фестиваля стал потрясающий праздничный фейерверк.

Григорий ЯРОМЧИК
Фото Сергея ХМЕЛЯ





У ДАПАМОГУ ЎСТАНОВАМ КУЛЬТУРЫ



Вясельны абрад «сыра»

Аматарскае аб'яднанне «Аматары фальклора «Жывая вада»
Ляплёўскага сельскага клуба
Кіраўнік: Лялько Лідзія Іванаўна

Запісана ў 1997 годзе ў вёсцы Ляплёўка Брэсцкага раёна ад Бондаравай Еўдакіі Іванаўны, 1934 г. н. і Луцюк Еўдакіі Пацееўны, 1932 г. н.

Выконваюць удзельнікі гурта:

Лялько Лідзія Іванаўна,
Бондарава Еўдакія Іванаўна,
Саседка Лідзія Ўладзіміраўна,
Оленева Алена Васільеўна,
Сакалаўская Анастасія Антонаўна,
Асіюк Ганна Афанасьеўна,
Новак Надзея Лукашаўна,
Асіюк Валянціна Міхайлаўна

Дзеючыя асобы: **сваха, дружко, запорожці, маладая, маці маладой і інш.**

(Гэтая часта абраду праводзіцца перад перапоем, калі вяселле трохі паела, і прыходзяць запарожці за сыром)

СВАХА:
Сватковы, парадьмося,
Горілкі напыймося.
Сыром закусымо,
Запорожцям нэ даймо.
Казалы нам сваты,
Казалы нам сваты
Вам сыра нэ даваты.
Яй сватов паслухала,
Яй сватов паслухала,
Вам сыра нэ зобрала.

ЗАПОРОЖЦІ:
Прыіхала сваха з міста,
Прыіхала сваха з міста,
З міста із Люблiна,
З былэсэнькім сыром,
З хорошым сымьяныном.
Дайтэ ій пыты-йсты,
Дайтэ ій пыты йсты,
У добрым місцы сісты.

СВАХА:
Мы йхалы лугамы,
Мы йхалы лугамы,
Крутымы дорогамы.
Возы поломылысь,
Сыры погубылысь.





ЗАПОРОЖЦІ:
А мы зарэ за вамы,
А мы зарэ за вамы
Крутымы дорогамы.
Возы нэ ломылысь,
Сыры нэ губылысь.

СВАХА:
Я сваха молодая,
Я сваха молодая,
Того ладу нэ знала,
Вам сыра нэ зобрала.

ЗАПОРОЖЦІ:
Було, сваха,
Нэ сварышыты,
Було, сваха,
Нэ сварышыты,
Людэй нэ смышіты.
Булаб така сіла,
Шчо нам сыра міла.

СВАХА:
А я сваха з Рогізны,
А я сваха з Рогізны,
Мoi сыры жэлізны.

ЗАПОРОЖЦІ:
Мы, дівчэта, зубаты,
Мы, дівчэта, зубаты.
Будэм сыра глодаты.

СВАХА:
Дівчэ-молодыці,
Дывчета-молодыці,
Вам сыр на полыці.
Ідітэ подэлітэ,
А свахі нэ дурітэ.

ЗАПОРОЖЦІ:
Наша сваха біліянка,
Наша сваха біліянка,
Ныма цыцкі —
Тылько ямка.
Тры дні клотчом выпыхала,
Шчоб цыцка стояла.

СВАХА:
Дівчэта, вітэ розы,
Дівчэта, вітэ розы.
Заспэвайтэ гожэ.
Я сыра вам маю
І даты гадаю.

ЗАПОРОЖЦІ:
Гожа сванічко, гожа,
Гожа сванічко, гожа,
Як у саду роза.
Як ясное сонца
Шчто світыть у воконцэ.
(Сваха дае сыра)
Дякум свасы за сыра,
Дякуем свасы за сыра.
Дай ій Божэ сына,
Як ясное сонца,
Шчо світыть у воконцэ.

(Рыхтуюцца да перапою.
Дружка ідзе за караваем)

Стара коровая місыть,
Стара коровая місыть.
У еі рука дрыжыть.
Возьмітэ мэнэ молодую,
Возьмітэ мэнэ молодую.
То я хоть потанцюю.
Ой, хорошы коровай, хорошый,
Бо хорошая коровайныця мысыла.
Ой, хорошы коровай, хорошый,
Бо хорошыі коровайныці лыпылы.
Ой, цыцаты наў коровай, цыцаты,
Бо цыцатая коровайныця мысыла.
Ой, ноздраты наш коровай, ноздраты,
Бо ноздратыі коровайныці лыпылы.
Ой, корова., короваю,
Ой, короваю, короваю.
Скіко ж до тэбэ кошту трэба.
Трэба мукіцы пшанычныі,
Трэба мукіцы пшанычныі,
Водыці крынычныі.
Трэба водыці крынычныі,
Трэба водыці крынычныі,
Масла от коровы.

Трэба масла от коровы,
Трэба масла от коровы,
Яец от кур ярых.

(Дружку палiваюць водкай на рукі і на нож. Маці нявесты дае дружку рушнік, каб выцярэць рукі і павязвае гэты рушнік яму цераз плячо. Дружка пачынае дзяліць каравай. Верхні ярус аддае маладым)

Дружко коровая крае,
Дружко коровая крадэ.
Запазуху хавае.
Та запазуху, то в наговыці
Для свэі молодыці.
(Першымі перапеваюць бацькі)
Пэрэпывай, матёнко,
Пэрэпывай, матёнко.
Шчасцем і здоровьем,
Здолэю добрыю.
Шчоб буллы богатыі,
Пшаныцію, жытом,
Пшаныцію, жытом,
А Маню з добрым жыцем.

(Да блізкіх родзічаў)

Нэ стыйтэ за двэрыма,
Не стыйтэ за двэрыма,
Не лыпайтэ гочіма,
А йдітэ до хаты,
А йдытэ до хаты,
Маню спомогаты.
І хоть із-за мора пэрэплывайтэ,
Молодую Маню спомогайтэ.

(Пасля перапою, калі госці яшчэ трошкі пасядзелі)

Ідэмо подэвімся — 2 р.
Чы едять коны сіно.
Як едять коны сіно — 2 р.
То шчэ мы посыдымо.
А як едять солому — 2 р.
То йдымо додому.

(Збіраюцца ад'язжаць, забіраюць нявесту)

Чы я тообі, моя матёнко,
З вэсны нэ казала,
Шчто нэ сій рудкі
Зэлёныі мяткі
Нэкому полываты.
Ой, як пойду, мое дітятко,
Твоімы дорожкамы.
Ой, то полью твое зільічко
Дробнымі слёзонькамы.
Кідай маты в піч жер, жер — 2 р.
Бо будэ по дочцы жель, жель.
Пропыла маты дочку — 2 р.
На солодком мэдочку.
Ны сама пропывала — 2 р.
Родына помогала.
Кідай маты в піч дрова — 2 р.
Бувай маты здорова.

Ой, нэ думай, молода Манечко,
Нэ думай.
Завэзуть тэбэ за рычыньку,
За Дунай.
Ой, як мні молодуй нэ думаты.
Як жэ мні свою свэкруху называты.
Назову свэкрухой, то будэ ій протывно.
Назову матёнкой, то будэ мні стыдно.
Ой, нэ плач, Маню,
Шчэ наплачышся потом,
Як будэш збыраты
Трісочкі под плотом.
Трісочкі збыраты,
Вэчэру готоваты.
Свойго мылого
З роботы чікаты.

Падрыхтавала да друку
Елена ПАДДУБНАЯ,
метадыст па дэкаратыўна-прыкладному мастацтву Метадычнага цэнтра ДУК «Брэсцкая раённая цэнтралізаваная клубная сістэма»
Вытрыманы народная вясельная традыцыя, стылістыка і арфаграфія мясцовай гаворкі.

Прафесару Адаму МАЛЬДЗІСУ — 85




7 жніўня энцыклапедысту беларускіх гуманітарных ведаў, доктару філалагічных навук, прафесару, віднаму дзеячу нацыянальнай культуры Адаму Мальдзісу спаўняецца 85 гадоў.

Нарадзіўся Адам Мальдзіс у сялянскай сям'і ў невялічкай вёсцы Расолы, якая на той час уваходзіла ў склад Ашмянскага павета, зараз гэта Астравецкі раён.

У 1956 годзе скончыў аддзяленне журналістыкі БДУ. Некалькі гадоў працаваў сакратаром Радашковіцкай раённай газеты. У 1962 годзе скончыў аспірантуру пры Інстытуце літаратуры ім. Я. Купалы АН БССР. І з гэтага часу Адам Мальдзіс назаўсёды звязаў сваё жыццё з навукай, з навукова-даследчыцкай дзейнасцю. За доўгія гады творчай працы ён выступаў на дзясятках міжнародных форумах навукоўцаў, чытаў лекцыі у еўрапейскіх універсітэтах, арганізоўваў з'езды славістаў, браў удзел у сотнях канферэнцый і «круглых сталоў».

Адам Мальдзіс пачынаў як даследчык літаратуры XIX стагоддзя. Яго кніга «Творчае пабрацімства» (1966) пра беларуска-польскія літаратурныя сувязі змяшчае мноства новых фактаў, здабытых у айчынных і польскіх архівах, мноства свежых думак, арыгінальных даследчыцкіх назіранняў. У кнізе «Падарожжа ў XIX стагоддзе» (1969) ім пададзены партрэты пісьменнікаў, музыкаў, падарожнікаў, дзеячаў вызваленчага руху. Выдаў даследаванне «Традыцыі польскага Асветніцтва ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя» (1972), «Таямніцы старажытных сховішчаў» (1974), «На скрыжаванні славянскіх традыцый» (1980), «Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII ст.: Нарысы быту і звычаяў» (1982, перавыдадзена ў абноўленым выглядзе 2001), «З літаратуразнаўчых вандраванняў» (1987), «Францыск Скарына як прыхільнік збліжэння і ўзаемаразумення людзей і народаў» (1988). Сумесна з літоўскай даследчыцай Альмай Лапінскене выдаў манаграфію «Перазовы сяброўскіх галасоў» (1988), дзе ўпершыню было паказана літаратурнае ўзаемадзеянне двух народаў ад старажытнасці да нашага часу. Пазней выйшлі яго кнігі «І ажываюць спадчыны старонкі: Выбранае» (1994), «Белорусские сокровища за рубежом» (2010) і многія іншыя.



Дарэчы, Адам Мальдзіс вывучыў і абараніў у літаратуразнаўстве і свядомасці сучаснікаў знакаміты «Астрамечаўскі рукапіс», даказаў яго Астрамечаўскія карані, а таксама з'яўляецца навуковым кіраўніком Брэсцкага раённага краязнаўчага часопіса «Астрамечаўскі рукапіс».

https://www.racyja.com/hramadstva/prafesaru-adamu-maldzisu-85

АСТРАМЕЧАЎСКІ РУКАПІС

БРЭСЦКІ РАЁННЫ КРАЯЗНАЎЧЫ АЛЬМАНАХ • № 3 [19]•2017

